Пралетары ўсіх краёў злучайцеся
פּראָלעטאַריער פון אַלע לענדער, פאַרייניקט זיך!

Proletariusze wszystkich krajów, łączcie się!
Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

XII год выданьня
Штодзённая газэта

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ САВЕТАЎ РАБОЧЫХ, СЯЛЯНСКІХ І ЧЫРВОНААРМЕЙСКІХ ДЭПУТАТАЎ САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БЕЛАРУСКАЙ С. С. Р.

СУБОТА
15 жніўня 1931 г.
№ 187 (3276)

УВЯЗАЦЬ УБОРКУ

з разгортваньнем асеньняй сяўбы

Вялікія задачы, якія стаяць перад партыйнымі, савецкімі і калгаснымі арганізацыямі, ў надыходзячую вясенню сяўбовую кампанію вызначаюцца тымі задачамі, якія пастаўлены партыяй у чацьверты год пяцігодкі, бо выкананьне плянаў асеньняй пасеўнай кампаніі 1931 г. і веснавой сяўбы 1932 г. адыграюць рашаючую ролю ў справе пасьпяховага выкананьня ўсяго народна-гаспадарчага пляну.

Гэтыя задачы з ўсёй вынукласьцю паказаны ў рэзалюцыі ліпеньскага пленуму ЦК КП(б)Б, яны знайшлі поўнае праламленьне ў пляне асеньняй пасеўнай кампаніі.

Практычна гэтая задача ва ўмовах БССР выражаецца ў тым, што мы ў надыходзячую асеньнюю пасеўную кампанію павінны будзем засеяць азімы клін у разьмеры 1.500.000 га пашырыўшы ў параўнаньні з леташнім на 500.000 га, пашырэньне плошчы пад азімыя культуры павінна ісьці па лініі асваеньня цаліны, раскарчоўкі, асушкі балот ды інш.

У часе правядзеньня веснавой сяўбы пашырэньне пасеўнага кліну за кошт вышэйпаказаных земляў спаткала ўпартае супраціўленьне з боку значнай часткі раёнаў, якія імкнуліся давесьці што ўся зямля ўжо асвоена і што пустуючай зямлі наогул няма.

Такія разважаньні бязумоўна будуць мець месца і ў часе асеньняй пасеўнай кампаніі. Пад гэтымі апартуністычнымі разважаньнямі крыецца простае нежаданьне мабілізоўваць масу на выкананьне пляну пашырэньня пасеўнай плошчы за кошт пашырэньня неасвоеных земляў. Гэтыя настроі павінны атрымаць самы жорсткі адпор з боку партыйных і савецкіх арганізацый.

Барацьба за падвышэньне ўраджайнасьці павінна заняць важнейшае месца ў плянах асеньняй пасеўнай кампаніі. Асаблівая ўвага павінна быць зьвернута на выкананьне ўсіх мерапрыемстваў ад якіх залежыць выкананьне задачы ў галіне падвышэньня ўраджайнасьці.

Асабліва трэба падкрэсьліць вялікую важнасьць выкананьня пляну зяблевага ворыва. У мінулым годзе з прычыны апартуністычнай недаацэнкі гэтага важнейшага мерапрыемства з боку пераважнай большасьці партарганізацый пляны ворыва пад зябь былі амаль поўнасьцю сарваны. Між тым іменна зяблевае ворыва адыгрывае важнейшую ролю ў справе падвышэньня ўраджайнасьці.

Трэба адзначыць асаблівую важнасьць правядзеньня ворыва пад зябь у раньнія тэрміны, бо ўзаранае зяблева ў жніўні месяцы дае значна большую эфэктыўнасьць, чымся ворыва ў кастрычніку.

У гэтым годзе ў БССР павінна быць узяты 1.000.000 га зяблевай успашкі.

Трэба з усёй рашучасьцю падкрэсьліць, што яшчэ і зараз існуе недаацэнка гэтага важнейшага мерапрыемства ў пераважнай большасьці раёнаў. Гэта падцьвярджаецца тым, што да сёньняшняга дню толькі некаторыя раёны прыступілі да ворыва, што вакол зябі не створана грамадзкая думка калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкіх мас аднаасобнікаў, што МТС якія ў выкананьні пляну зяблева павінны адыграць важнейшую ролю, яшчэ таксама не разгарнулі работы ў гэтым напрамку.

Партыя з усёй рашучасьцю ставіць пытаньне аб узьняцьці ўраджайнасьці сацыялістычных палёў. Барацьба за зябь ёсьць барацьба за ўраджай. Вось чаму апартуністычная недаацэнка зяблевага ворыва павінна быць бязьлітасна біта. Партарганізацыі павінны забясьпечыць рашучы перадом у гэтай справе, пляны зяблевага ворыва павінны быць поўнасьцю выкананы.

Асеньняя пасеўная кампанія павінна быць праведзена пад пунктам гледжаньня далейшай спэцыялізацыі сельскай гаспадаркі БССР, што павінна знайсьці поўнае ажыцьцяўленьне ў рабочых плянах кожнага саўгасу, калгасу і сельсавету.

Асеньняя сяўба павінна прайсьці пад лёзунгам далейшага разгортваньня калектывізацыі пры адначасовым гаспадарчым умацаваньні ўжо існуючых і нанова арганізуемых калгасаў, пад лёзунгам барацьбы за зьдзельшчыну, за наладжваньне вучоту працы, пад лёзунгам упартай барацьбы з кулацкай ўраўнілаўкай ў разьмеркаваньні даходаў у калгасах.

Асабліва вялікія задачы ў правядзеньні асеньняй сяўбы ўскладаюцца на МТС. Яны павінны ўзьняць на мезіш 250.000 га цаліны. Гэта вымагае ад іх каб яны ў максымальна кароткі тэрмін скончылі ўборачную і поўнасьцю пераключыліся на барацьбу за пляны зяблева, за пляны асеньняй сяўбы.

ЦК КП(б)Б вызначыў жорсткія тэрміны правядзеньня асеньняй пасеўнай кампаніі. Пасеў азімых у паўночнай зоне павінен быць скончан да 1-га верасьня, у сярэдняй зоне да 5 верасьня і ў паўднёвай зоне—да 10 верасьня.

Зацяжка ўборкі і абмалоту ўраджаю зьяўляецца буйнейшай перашкодай на шляху разгортваньня асеньняй сяўбы.

Задача ўсіх партарганізацый, усіх сельсаветаў, калгасаў і саўгасаў заключаецца ў тым, каб арганізаваць работу, расставіць сілы так, каб забясьпечыць скончэньне ўборкі ўраджаю ў самы кароткі тэрмін, увязаўшы ўборку з разгортваньнем ворыва пад зябь, з баявым пасьпяховым правядзеньнем асеньняй сяўбы.

Выканаць тыя важнейшыя задачы, якія стаяць перад намі ў надыходзячую асеньнюю сяўбу можна будзе толькі тады, калі партарганізацыі, райвыканкомы, сельсаветы і ўсе саўгасна-калгасныя органы зразумеюць усю вялічыню задач, якія пастаўлены партыяй, калі партыйныя арганізацыі яшчэ больш узмоцняць барацьбу з кулацтвам і яго агентурай—правымі і «левымі» ухілістамі. Калі партарганізацыі здолеюць сваячасова па бальшавіцку пераключыць усе сілы і мабілізаваць на выкананьне плянаў асеньняй сяўбы шырокія масы калгаснікаў, бедняцкоў і серадняцкоў-аднаасобнікаў.

РЭВАЛЮЦЫЙНАЕ ПОЛЫМЯ РАЗГАРАЕЦЦА

ЗЬВЕРСКАЯ РАСПРАВА ФАШЫЗМУ НАД ПАЛІТВЯЗЬНЯМІ, КАРНЫЯ ЭКСПЭДЫЦЫІ, ПАГРОМЫ НЯ ВЫРАТУЮЦЬ ДЫКТАТУРЫ БУРЖУАЗІІ

Карныя экспэдыцыі на Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне

ВІЛЬНЯ. 14-8. Увесь фашысцкі друк узьняў вялікую кампанію падрыхтоўкі «грамадзкай думкі» да чарговага крывавага паходу карных экспэдыцый на Заходняй Украіне і Заходняй Беларусі.

Паасобныя атрады карнікаў і цяпер раз'яжджаюць, спусташаюць, зьнішчаюць вёскі на Зах. Беларусі і Зах. Украіне і ў самой Польшчы пры спагнізьні падаткаў, пры выгане на дармовую прымусовую працу і інш. «Заспакаеньне» крэсаў на поўным ходу. Адкак, як відаць фашысцкі ўрад рыхтуе яшчэ больш шырокую кампанію крывавага паходу.

Калі летась пры «пацыфікацыі» Зах. Украіны масавы адпор бяднякоў і сераднякоў выліваўся ў падпальваньнях панскіх маёнткаў у паасобных выпадках забойствах чыноўнікаў, дык сёлета працоўныя масы Зах. Беларусі, Зах. Украіны і самой Польшчы даюць больш рашучы адпор, больш масавы і на ўдары адказваюць ударамі. Гараць панскія маёнткі, ідуць сутычкі з паліцэйскімі атрадамі, з атрадамі карнікаў. Упартая, заўзятая бойка паміж прыгнятацелямі і эксплёатуемымі працоўнымі масамі разгараецца. Рэвалюцыйнае полымя ахапляе з кожным днём усё новыя гарады, мястэчкі і вёскі. Блізіцца час расплаты.

Бастуюць парабкі ў маёнтку Стоках

ВІЛЬНЯ. 14-8. У маёнтку СТОКІ памешчыцы Ўмястоўскай забаставалі ўсе парабкі і патрабуюць неадкладнай выплаты заробку за мінулы час і павышэньня заработку на 20 проц.

Мясцовыя бядняцка - серадняцкія масы сялянства падтрымліваюць бастуючых салідарызуюцца з іх барацьбой і пры ўсім стараньні памешчыцы ёй не ўдалося знайсьці ніводнага штрэйкбрэхера. У маёнтак выехаў вялікі атрад паліцыі для «ліквідацыі забастоўкі».

Паліцэйскі паход супроць рэвалюцыйнага руху і яго авангарду—кампартыі ў Нямеччыне

Кампартыя арганізуе пралетарскае контр-наступленьне

БЭРЛІН. 13-VIII. Па Бэрліну распаўсюджваецца нелегальная газэта лёзунг якой: «ад рэвалюцыйнага народнага галасаваньня да рэвалюцыйнага народнага суду». Газэта падагульвае вынікі барацьбы за роспуск прускага ландтагу. Перадавы артыкул гаворыць: «пан сацыял-дэмакратычны паліцэй-прэзыдэнт, другі Бісмарк і Путкамэр, захапіў будынак рэвалюцыйнага пралетарыяту... ён разганяе партработнікаў дэпутатаў. Ён хоча разбурыць друкарню і выдавецтва. Ён праводзіць новую форму забароны партыі, ён ня ведае, што бэрлінскі пралетарыят натолькі адданы справе камунізма, што яго адказам на захоп дому імя Карла Лібкнэхта будзе масавая агітацыя такой сілы і нянавісьці, што новыя тысячы працоўных пойдуць пад чырвоныя сьцягі.

Кулі Грэжэйнскага трапляюць у Нямеччыну, якая з усіх бакоў ужо гарыць. Шум кулямётаў павінен заглушыць гучныя крыкі мільёнаў галадуючых беспрацоўных і працуючых эа жабрацкі заработак рабочых. «Далоў капіталізм». «За арганізацыю рэвалюцыйнай самадапамогі народам».

Калі Брунінг і Зэвэрынг пад гучным лёзунгам нацыянальнай самадапамогі пачынаюць жорсткае скарочаньне заработку і дапамогі і падвышэньне пошлін—тады працоўны народ павінен адказаць контр-атакай.

За канфіскацыю маемасьці буйных капіталістаў. За павялічэньне заработку і дапамогі. Далоў абанкруціўшыся капіталізм, які зараз перакладае свае мільярдныя страты на плечы пралетарскіх мас.

Рабочыя заводаў. Зразумейце, што ў вас ёсьць эброя, пры дапамозе якой вы можаце правесьці і правядзеце свае патрабаваньні. Гэта эброя—забастоўка. Яна зьяўляецца тым нажом, які ўдарыць ў сэрца капіталізму, калі маса заводзкага пралетарыяту аб'ядняецца ў баявы саюз беспрацоўных.

Мы узьнімаем наш голас пратэсту супроць нячуваных дзеяньняў фашысцкіх катаў

РЭЗАЛЮЦЫЯ ПРАТЭСТУ АГУЛЬНАГАРАДЗКОГА МІТЫНГУ РАБОЧЫХ І СЛУЖАЧЫХ г. МЕНСКУ

У адказ на адозву ЦК кампартыі і МОПР'у Польшчы, Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны да рабочых і сялянскіх мас сьвету, агульны гарадзкі мітынг рабочых, служачых і ўсіх працоўных гораду Менску выказвае сваю салідарнасьць з вядучымі гераічную барацьбу пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі працоўнымі масамі Польшчы, Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны.

Мітынг заяўляе катэгарычны пратэст супроць нячуванага разгулу бела-фашысцкага тэрору ў Польшчы, Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны.

Сьціснуты вострым эканамічным крызісам, пад ударамі магутнага росту рэвалюцыйнага руху ў Польшчы, Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне, польскі фашызм шукае выхаду ў новым узмацненьні наступу на рабочую клясу і працоўныя масы, у задушэньні рэвалюцыйнага руху і ў падрыхтоўцы вайны супроць Савецкага Саюзу—ударнай брыгады сусьветнага пралетарыяту.

Рабуючы працоўныя масы, фашызм шалёна ўзбройваецца, узмацняе тэрор. Пераполўніўшы турмы рэвалюцыйнымі рабочымі і сялянамі, польскі фашызм узмацняе фізычнае зьнішчэньне рэвалюцыянэраў—авангарду—камуністычнай партыі, «узаконьваючы» гэта новым турэмным рэглямантам, які ўводзіцца ў турмах фашысцкай Польшчы.

Польскі фашызм, у саюзе з сацыял і нацыянал-фашызмам імкнецца насадзіць магільную цішыню—спакой у тылу на Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне для анты-савецкага нападу.

Дзесяць тысяч палітзьняволеных церпяць нячуваныя зьдзекі і катаваньні. Ня гледзячы на стараньні фашысцкай жандармэрыі ўтоіць усё тое, што адбываецца ў засьценках турмаў, голас ахвяр фашысцкай дыктатуры праз перагароды крывавага тэрору прарываецца да шырокіх мас рабочых і сялян.

Мы чуем, таварышы, ваш голас, ваш заклік на дапамогу. Мы ўзьнімаем наш голас пратэсту супроць нячуваных дзеяньняў фашысцкіх катаў. Мы патрабуем вызваленьня палітзьняволеных.

Таварышы, рэвалюцыйныя рабочыя, сяляне Польшчы, Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны. Таварышы палітзьняволеныя, мы заклікаем вас яшчэ больш упарта змагацца з фашысцкай дыктатурай. Мы заяўляем, што вы не адны ў гэтай барацьбе, з вамі ўсе працоўныя сьвету, з вамі 150 мільённая ўдарная брыгада сусьветнага пралетарыяту,—рабочыя і сяляне Савецкага Саюзу, якія выконваюць сваю інтэрнацыянальную задачу—будаўніцтва сацыялізму ў сваёй краіне.

У адказ на бела-фашысцкі тэрор, мы яшчэ больш узмацнім тэмпы выкананьня задач трацяга рашаючага году пяцігодкі, задач пабудовы сацыялізму, задач узмацненьня абароназдольнасьці Савецкага Саюзу. Мы яшчэ мацней згуртуемся пад кіраўніцтвам ленінскай камуністычнай партыі і яе ЦК.

Мы рабочыя і ўсе працоўныя гораду Менску працягваем вам брацкую руку дапамогі і ўносім 60 тысяч руб. у фонд зімовай дапамогі палітзьняволеным. Абавязваемся ўзмацніць інтэрнацыянальную сувязь, усіх рабочых фабрык і заводаў, ахапіць МОПР'ам.

Мы заклікаем рабочых і сялян Савецкай Беларусі і Савецкага Саюзу, выносіць пратэсты супроць нячуваных дзеяньняў фашысцкіх катаў. Працягне це руку дапамогі палітзьняволеным Польшчы, Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны.

Далоў белы тэрор! Далоў фашысцкую дыктатуру Пілсудзкага! Далоў фашысцкі турэмны рэглямант, далоў арганізатараў нападу на СССР!

Няхай жыве кампартыя і МОПР Польшчы, Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны! Няхай жыве рабоча-сялянская ўлада Польшчы, Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны!

Няхай жыве сусьветная пралетарская рэвалюцыя!

Крызіс катастрафічна паглыбляецца

БЭРЛІН. 10-VIII. Надзвычайныя труднасьці збыту прадукцыі ў Рурскай каменавугальнай прамысловасьці прымусілі за апошні час да закрыцьця раду абсталяваных на апошнім слове тэхнікі капальняў.

Так, толькі за першае паўгодзьдзе 31 г. спынена работа на 5 удасканаленых капальнях з якіх на буйнейшай капальні «Рэйн-Эльбэ-Альма», здабывалася каля 1,12 мільёнаў тон вугалю у год. Паводле навейшых даных, пасьля скончэньня вайны, да 31 чэрвеня 1931 г. закрыта 113 капальняў, гадавое здабываньне якіх раўнаецца 22 мільёнам тон. На гэтых капальнях было занята 82 тысячы рабочых. Адпаведна гэтаму ідзе працэс зніжэньня здабываньня вугалю.

За першае паўгодзьдзе 1931 г. здабываньне вугалю складала 44 мільёны тон супроць 56 мільёнаў тон за той-жа перыяд мінулага году. Лік рабочых у Рурскім камена-вугальным басэйне скараціўся з 355 тысяч на 30 чэрвеня 1930 г. да 290 тысяч на 31 сьнежня 1930 г. і складае ў сучасны момант 251 тысячу. Першыя дні чэрвеня бягучага году прынесьці з сабой новае скарочаньне збыту і новыя звальненьні гарнякоў.

Буржуазія абгаварвае пытаньне а забароне кампартыі

БЭРЛІН. 12-VIII. Орган нямецкай прамысловасьці «Рэйніш Вэстфалішэ Цэйтунг» піша па пытаньні аб падрыхтоўцы за забароны нямецкай кампартыі: «паведле атрыманых намі вестак палітычныя колы абгаварвалі пытаньне аб забароне кампартыі Нямеччыны, прычым прыйшлі да заключэньня, што ў даны час такая забарона не мэтазгодна, галоўным чынам таму, што тэхнічна амаль немагчыма правесьці ў жыцьцё забарону такой буйнай арганізацыі, як кампартыя.

У сувязі з гэтым пытаньнем зазначаюць на неабходнасьць улічыць вопыт забароны саюзу чырвоных фронтавікоў, які цішком прадоўжвае існаваць».

Далей газэта выказвае, што прускі ўрад лічыць неміндазгодным забарону кампартыі ў адзэй толькі Прусіі, і таму прапанавала нямецкаму міністру ўнутраных спраў абгаварыць пытаньне аб забароне кампартыі ва ўсёй Нямеччыне.

«У выпадку неабходнасьці,—піша газэта,—лічуць, што самым падыходзячым сродкам будзе ўвядзеньне ў паасобных вобласьцях краіны стану аблогі».

Загад—катаргі не жалець

БЭРЛІН. 13-VIII. Прускае міністэрства ўнутраных спраў выдала загад усім паліцэйскім кіраўніцтвам аб правядзеньні надзвычайнага дэкрэту аб барацьбе з «палітычнымі выступленьнямі».

У гэтым распараджэньні сацыял-дэмакратычны міністр унутраных спраў Зэвэрынг заяўляе аб неабходнасьці забароны сходаў рэвалюцыйнай прафапазіцыі.

Бальшавіцкі плян--

засеяць 1.350.000 га азіміны, узьняць 1.100.000 га пад зяб--павінен быць выканан поўнасьцю і ў тэрмін

Калгасы „Энэргія", Ельскага раёну, „1-га Мая" і „Прамень Камуны", Бабруйскага раёну, высунулі сустрэчныя пляны асеньняй сяўбы

БАЯВАЯ ЗАДАЧА—УВЯЗАЦЬ УБОРАЧНУЮ З АСЕНЬНЯЙ ПАСЕЎНАЙ!

Па калгасах Бабруйшчыны абгаварваюцца пляны асеньняй сяўбы

Па Бабруйшчыне разгарнулася падрыхтоўка да асеньняй сяўбы. Калгасы Малеўскага сельсавету ужо высунулі сустрэчныя пляны па пашырэньні асеньняга засеўнага кліну. Сустрэчны плян калгасу 1-га мая на 20 проц. перавышае плянавае заданьне веснавой сяўбы, калгасу «Прамень Камуны»—на 15 проц. У калгасах шырока разгорнута абгаварэньне плянаў асеньняй сяўбы (Белта).

Па баявому ўзяцца за падрыхтоўку да асеньняй сяўбы

Уборку жыта калгас «Кастрычнік», Аршанскага раёну, скончыў. Зараз пачалася ўборка 45 га лёну. Гэта—адказьнейшы вучастак с.-г. палявых работ на даным этапе. Калгас ня мае лёнаўборачных машын, а таму ўсю ўборку трэба правесьці ўручную. Гэта вымагае правесьці ўсю працу па ўборцы лёну на аснове зьдзельшчыны, шырока разгортваючы сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва.

Адначасна з лёнаўборкай, у калгасе пачалася малацьба. Сход калгасу паста навіў першы абмалочаны сноп у 20 цэнтн. збожжа ссыпаць у засеў дзяржавы.

Падрыхтоўка да асеньняй сяўбы ў калгасе яшчэ не разгорнута: ня скончана ўзьмешваньне ральлі пад засеў жыта, не абмалочана лепшае збожжа на насеньне.

Трэба аддаць больш увагі асеньняй сяўбе, каб сваячасова скончыць падрыхтоўку і правядзеньне гэтай заключнай палявой с.-г. кампаніі гэтага году.

Масаловіч Яўхім.

На нарадзе сакратароў лёнаводных раёнаў

ВІЦЕБСК, 12-8. (Ад нашага спэцкар.). 11-га жніўня ў г. Віцебску адбылася куставая нарада сакратароў РК КП(б)Б Гарадоцкага, Лёзьненскага, Дрысенскага, Полацкага, Асьвейскага, Бешанковіцкага; Мсьціслаўскага; Шклоўскага і іншых лёнаводных раёнаў. Нарада заслухала інфармацыю з месц аб ходзе ўборкі лёну.

У радзе раёнаў уборка лёну разгортваецца надзвычайна марудна. Пляны ўборкі лёну да калгасаў даведзены са значным спазьненьнем. Так, у Сіроцінскім раёне апэрацыйны плян уборкі лёну складзены толькі 4-га жніўня, г. зн. тады, калі калгасы ўжо прыступілі да лёнацерабленьня. Гэты плян паводле разьліку раёну, павінен трапіць у калгасы да 16 жніўня.

Раённыя кіруючыя ўстановы ня ведаюць як абстаіць справа са зьдзельшчынай. Толькі зараз арганізаваны курсы ў раёне для азнаямленьня з лёнаўборачнымі машынамі.

Асабліва ў дрэнным становішчы знаходзіцца ўборка лёну ў Асьвейскім раёне. У гэтым раёне лёнаўборка, па заяве самога сакратара, ідзе самацёкам. Плян уборкі адсутнічае. Уборка лёну ў гэтым раёне пад пагрозай зрыву. Кіруючы склад раённых работнікаў разьехаўся у адначынак. Зьдзельшчына ня ўведзена ніводным калгасам.

Дрэнна абстаіць справа са зьдзельшчынай ва ўсіх лёнаводных раёнах. Амаль ва ўсіх раёнах зьдзельшчына ўведзена толькі ў 50 проц. калгасах раёну. Гэта стварае пагрозу сваячасовай уборцы лёну.

Цягнуцца ў хвасьце ўборкі МТС, асабліва МТС Гарадоцкага раёну. Нарада таксама зьвярнула ўвагу, што амаль ніводзін з раёнаў не зьвярнуў дастатковай увагі аднаасобнаму сэктару. У радзе месц аднаасобнік застаўся на-за апэрацыйным плянам уборкі.

У прынятай пастанове нарада заваскрыла асаблівую ўвагу на пытаньні штодзённага апэрацыйнага кіраўніцтва лёнаўборкай, выпраўленьня нахаду памылак і ліквідацыі раду прарываў, асабліва па зьдзельшчыне і вучоту працы ў калгасах.

ЯКУБ ПАЛЯШУК.

Жніва і малацьба— адзін вытворчы працэс

Гарадок. 9-VIII. (Ад нашага спэцкора). Уборка азімых у Гарадоцкім раёне (раён лёнаводзтва) скончан за 3 дні раней вызначанага тэрміну. Перадавыя калгасы на ўборцы азімых далі рэкордныя паказьнікі. Так, камуна імя Леніна ўшчыльніла тэрміны ўборкі ў 3 разы супроць пляну. Плянам прадугледжана было закончыць уборку на працягу 15 дзён, фактычна-ж ўборка працягвалася 5 дзён.

Асаблівай увагі заслугоўваюць ўборка азімых у калгасе «Беларускі Батрак». Гэты калгас на ўборку азімых першага-ж дню выйшаў ў поле разам з малатарняй. Разам з уборкай тут-жа на полі ўтвараецца і малацьба. Праца арганізавана брыгадна-канвэернай сыстэмай на прынцыпах зьдзельшчыны пры цьвёрдых нормах выпрацоўкі.

Такім чынам, жніва, малацьба, веяньне; ссыпка чыстага гатовага насеньня—усё гэта рабіцца тут-жа па полі ў часе жніва. Пры такой арганізацыі працы калгас ня толькі на сёньняшні дзень мае ў засеках чыстае гатовае зерне для асеньняй сяўбы і збожжа-загатовак але з'эканоміў 208 чалавека-працадзён і шмат конскай сілы, што ў пераводзе на грошы па грубых падліках дае эканоміі каля 1000 руб. Жніва і малацьба разам ніколькі не зацягнулі ўборкі.

Зараз перадавыя калгасы раёну пераключыліся на ўборку лёну; некаторыя з іх яшчэ да атрыманьня пляну хлебазагатовак накіроўваюць чырвоныя абозы з хлебам. 5-га жніўня ў раён прыбыў чырвоны абоз з новым ураджаем ад калгасу «Лесінскі шлях».

Дзяжуючы разгортваньню масавай работы ў раёне наглядаецца масавы калгасны прыліў. За апошнюю дэкаду ў калгасы ўлілося 217 бяднацка-серадняцкіх гаспадарак.

Чарговай задачай у сельска-гаспадарчых работах зьяўляецца падрыхтоўка і ўдарнае правядзеньне асеньняй сяўбы.

Якуб Паляшук.

Плошча пад асеньні засеў яшчэ занята ня ўбранаю ярыною

АСЬВЕЯ. (Белта) У новым саўгасе «Асьвея» арганізацыйная і гаспадарчая справа пастаўлена вельмі дрэнна. У саўгасе адсутнічаюць сацыялістычныя мэтады працы—ударніцтва і сацспаборніцтва, палітыка-выхаваўчая работа сярод рабочых саўгасу не праводзіцца. Сапраўдная зьдзельшчына ў калгасе ня ўведзена. У рабоце саўгасу вяць пад пагрозу зрыву асеньняю сяўбу, з прычыны таго, што жыта павінна сеяцца на плошчы, якая занята яравымі.

Райвыканком, партыйныя і гаспадарчыя арганізацыі зусім не зварочваюць належнай увагі на такое становішча маладога саўгасу.

Калгас „Энэргія" высунуў сустрэчны плян асеньняй сяўбы

Калгас «Энэргія», Санюкоўскага сельсавету, Ельскага раёну, яшчэ да вясновай сяўбы перайшоў на зьдзельшчыну ва ўсіх галінах гаспадаркі, усе калгасьнікі працавалі брыгадамі. Да пачатку ўборачнай калгас абагуліў усе азімыя і яравыя пасевы.

Ударныя мэтады працы на аснове сацспаборніцтва і ўдарніцтва пры правільным кіраўніцтве партарганізацыі, укараненьні зьдзельшчыны, правільным вучоце працы, сваячасовым запісе працадзён у кніжку кожнаму калгасьніку, а таксама пры дапамозе што дзённай палявой газэты «Ударнік уборачнай», — калгас скончыў уборку сена, азіміны і ярыны.

Прапрацаваўшы пастановы аб прыкладным разьмеркаваньні ўраджаю на агульным сходзе калгасьнікаў супольна з аднаасобнікамі, калгасьнікі абавязаліся:

Правесьці асеньнюю сяўбу на плошчы 120 га, для чаго да 20-га жніўня скончыць культываваньне папару, адрамантаваць інвэнтар і набыць зігзагавыя бароны.

Да тэрміну даставіць 1,5 тон штучнага ўгнаеньня, ачысьціць 1.200 пудоў насеньня і засеяць 60 га гатункавым насеньнем.

Бульбу ўбраць на працягу 10 дзён. 12 жніўня прыступіць да малацьбы жыта і сваячасова здаць да ўстаноўленага тэрміну хлебазагатоўкі.

Закончыць у тэрмін будаўніцтва ў калгасе і ўкамплектаваньне яго жывёлай

Пашырыць азімы клін на 10 га.

Высоўваючы сустрэчныя пляны,—заяўляюць калгасьнікі,—мы выклікаем усе калгасы БССР пайсьці па нашым прыкладзе.

П. Г.



Чытаюць палявую газэту «Ударнік уборачнай» (калгас «Энэргія» Санюкоўскі с-с, Ельскага р-ну).

Белмэталяаб'яднаньне і сэктар кадраў ВСНГБ

упарта не жадаюць падвышаць кваліфікацыю спэцыялістаў

Рад ранейшых пастаноў партыі і ўраду аб аўладаньні тэхнікай і апошняя пастанова ЦК УсеКП(б) аб тэхнічнай прапагандзе ставяць рубам пытаньне аб неабходнасьці ня толькі ліквідацыі элемэнтарнай тэхнічнай неграмотнасьці, але і падвышэньне кваліфікацыі і пераквалфікацыі сярэдняга інжынэрна-тэхнічнага пэрсаналу. Між тым, у практычным ажыцьцяўленьні гэтых пастаноў мы сустракаемся з радам цяжкасьцяй і бюракратычных адносін да гэтай важнейшай справы з боку асобных арганізацый. Вось яскравы прыклад:

На працягу 4-х год канструктары і тэхнікі-мэханікі заводу імя Варашылава, «Камунар» і Белмэталяаб'яднаньня, некаторыя з якіх маюць 6-8-гадовы і больш стаж, хадайнічаюць перад вышэйшымі органамі аб падняцьці іх кваліфікацыі і да гэтага часу мы нічога ня можам дабіцца. Неаднаразова мы гэта пытаньне падымалі перад сэктарам кадраў ВСНГ, Белмэталяаб'яднаньнем, але гэтыя арганізацыі не рэагавалі на нашы патрабаваньні.

У мінулым годзе пры Менскім Будаўнічым Інстытуце па нашых дамаганьнях было арганізавана аддзяленьне па пераквалфікацыі мэханікаў, тэхнікаў і канструктараў па спэцыяльнасьці вэнтыляцыі і апалу, куды падалі заявы і дакуманты ўсе нашыя спэцыялісты, якія жадалі ці павысіць кваліфікацыю, ці пераквалфікавацца. Але Белмэталяаб'яднаньне даведаўшыся аб адчыненьні гэтага аддзяленьня і аб тым што яго спэцыялісты падалі заявы аб паступленьні, баючыся таго, што пасьля скончэньня курсу вучобы спэцыялісты пакінуць сваю работу ў аб'яднаньні і пяройдуць на работу ў іншыя арганізацыі,—адмовілася фінансаваць курсы і нават напісала афіцыйную просьбу Будзіністуту, каб спэцыялістам Белмэталяаб'яднаньня было адмоўлена ў прыёме на курсы.

У выніку гэтага аддзяленьне распалася. Але мы ўпарта прытрымліваліся жаданьня падвысіць сваю кваліфікацыю і ў маі м-цы зьезд ІТР саюзу машына-будаўнічых рабочых па нашай ініцыятыве рашыў прасіць адпаведныя органы аб арганізацыі ў Менску і Гомлі вячэрніх аддзяленьняў для пераквалфікацыі тэхнікаў—мэханікаў у інжынэраў.

Гэтая пастанова некалькі разоў абмяркоўвалася на Бюро ІТР саюзу і МБІТ'е, але, далей гэтага справа не пайшла таму, што гэтыя арганізацыі па бюракратычнаму змазалі нашае пытаньне і не далі яму ходу.

Нарэшце мы паднялі гэта пытаньне перад сэктарам кадраў ВСНГБ, але і тут не знайшлі патрэбнага падтрыманьня.

Зараз мы праз друк зварочваемся яшчэ раз да ВСНГБ і Мэталяаб'яднаньня з патрабаваньнем неадкладна абгаварыць нашыя прапановы і пастанову зьезду ІТР з тым, каб ажыцьцяўленьне гэтай пастановы было тэрмінова выканана.

Група спэцыялістаў тэхнікаў-мэханікаў і канструктараў заводу імя Варашылава, **Гінзбург, Мінкоў, Урэцкі, Рошчын, Вайнштэйн, Спявак.**

Ад рэдакцыі: Мы просім сэктар кадраў ВСНГ і Белмэталяаб'яднаньне зараз-жа адказаць на старонках нашай газэты па закранутым групай спэцыялістаў пытаньні.

Ю. Ленскі

НАСУСТРАЧ БУЙНЕЙШЫМ БАЕМ у ПОЛЬШЧЫ

Рад масавых баёў, якія адбыліся за апошнія месяцы ў Польшчы, паказвае новую, вышэйшую стадыю рэвалюцыйнага ўздыму, якая ставіць перад кампартыяй Польшчы надзвычайна адказныя задачы.

Пленум ЦК кампартыі Польшчы, які нядаўна адбыўся і рашэнні якога абгрунтаваны на ўказаньнях XI пленуму Выканкому Камінтэрну, даў падрабязны аналіз насьпяваньня прадпасылак рэвалюцыйнага крызісу ў Польшчы і выцякаючыя з гэтага аналізу дырэктывы на бліжэйшы пэрыяд.

За апошнія месяцы рэзка абвастрыўся фінансавы крызіс, які выяўляецца ў першую чаргу ў вострым дэфіцыце дзяржаўнага бюджэту. Дэфіцыт за люты-чэрвень дасягнуў нябывалай сумы—126 млн. злотых, тады як за ўвесь папярэдні год ён склаў 53 млн. злотых. У Польшчы, ня маючай вялікіх капіталаў, пры слабым прыліве замежных капіталаў і ўзмацненні—таксама пад уплывам фінансавага крызісу ў Нямеччыне—адліву капіталаў, востры бюджэтны дэфіцыт можа ў бліжэйшы час выклікаць буйныя банкрутцвы падобна таму, як гэта мела месца ў Нямеччыне. Рэзэрвовы фонд Польскага банку ў першым толькі, паўгодзьдзі скараціўся на 30 проц. Пагроза інфляцыі шпарка набліжаецца.

Ратуючыся ад банкрутства, урад Пілсудзкага скарачае на 16 проц. выдаткі за кошт дзяржаўных служачых і беспрацоўных. Аднак, гэты палітычны ня змог аднавіць «раўнавагу» бюджэту, прывёўшы толькі да далейшага звужэньня ўнутранага рынку.

Адзначаны ў рэзалюцыі XI пленуму Выканкому Камінтэрну працэс развалу гаспадарчага жыцьця Польшчы пацьвярджаецца такімі фактамі, як за чыненьне двух буйнейшых банкаў (Гандлёвага банку ў Лодзі і банку Сталгагена ў Прымерскай вобласьці), як банкрутства раду вялізарных прадпрыемстваў накшталт «Візэўскай мануфактуры» і г. д.

Нямінучы новае рэзкае скарачэньне прамысловай вытворчасьці і падзеньне цэн на сельска-гаспадарчыя прадукты. Скараціўшаяся за апошнія тры месяцы быццам на 120 тыс. (з 380 да 260 тыс.) колькасьць зарэгістраваных беспрацоўных пачне зноў скачкамі ўзрастаць. Вёска будзе ўсё больш бяднець. «Набліжаючаяся восень і зіма будуць цяжкім выпрабаваньнем для польскай грамады»—піша «Кур'ер Пазнанскі».

«Мы павінны перачакаць,—паўтарае адзін з органаў пілсудчыны—«Слово польске». —Толькі нейкая вялізарная натуга ўсёй грамады, асабліва замежных кляс, якія павінны зразумець, што глеба гарыць у іх пад нагамі, магла-б вывесьці з сучаснага становішча».

Але працоўныя масы ня могуць і ня хочуць цярпліва чакаць. Шалёнае наступленьне капіталу сустракаецца з рэвалюцыйным контрнаступленьнем пралетарыяту, якое разьвязвае сілы рэвалюцыйнага сялянства і нацыянальна-вызваленчага руху і ўцягвае ў барацьбу элемэнты гарадзкой дробнай буржуазіі, якая яшчэ хістаецца. Мена віта гэта ўсеагульнасьць рэвалюцыйнага ўздыму—пры яго значнай яшчэ нярэўнамернасьці — характарызуе пералом, які стварыўся ў шырокіх масах пралетарыяту і эксплёатуемага сялянства. 1-е мая, Яворжна (стачка гарнякоў, перайшоўшая ў барыкадныя баі), забастоўкі ў Дамброўскім раёне, стачка трамвайшчыкаў у Варшаве, стачка маракоў у Гдыні, ўсеагульная забастоўка ў Гродні—вось асобныя зьвены гэтага пералому.

Ужо выключна баявы характар майскіх дэманстрацый, у якіх актыўны ўдзел прымала таксама сялянская маса, упартая барацьба за вуліцу сьведчылі аб высокім узроўні рэвалюцыйнай актыўнасьці мас, ідучых пад камуністычнымі сьцягамі.

Барыкадныя баі ў Яворжне сыгналізавалі-б глыбокім узрушаньні ў масах, пераходзячых да вышэйшых форм барацьбы. Частковая забастоўка дамброўскіх гарнякоў на чале з камуністамі, наперакор сацыял-фашыстам, якія хацелі разрадзіць атмасфэру пры дапамозе аднадзеннай забастоўкі, гаварыла аб надышоўшым зруху ў забастовачным руху. Забастоўка трамвайшчыкаў у самым цэнтры фашыцкай дыктатуры ўзьняла на барацьбу адставшыя да гэтага часу атрады пралетарыяту ў стратэгічна важных для фашызму пунктах (дзяржаўныя і муніцыпальныя служачыя, маракі, чыгуначнікі).

Такім чынам, значна пашырыўся фронт забастовачнай барацьбы; цэнтр вагі перасунуўся да буйных прадпрыемстваў; яскрава выявілася тэндэнцыя да пашырэньні забастовачнай барацьбы на цэлыя галіны вытворчасьці. Перарастаньне абаронных стачак у наступальныя, высокі ўзровень баявой салідарнасьці бастуючых, узрастаючы ўдзел беспрацоўных, злучэньне забастовак з барацьбой за вуліцу, спалучэньне эканамічнай і палітычнай барацьбы—прымусілі буржуазію і ўрад пайсьці на ўступкі. Адсюль пераважная большасьць пераможных забастовак, выклікаючых у рабочай клясе ўпэўненасьць у сваіх сілах. **У гэтым заключаецца іх міжнароднае значэньне.**

Калі забастоўкі рурскіх гарнякоў і бэрлінскіх мэталістаў даказалі масам, што кампартыя і рэвалюцыйныя прафарганізацыі зьяўляюцца адзінай сілай якая змагаецца супроць перакладваньня цяжкасьцяй крызісу на плечы працоўных, дык апошнія забастоўкі ў Польшчы даказалі магчымасьць пераможнай барацьбы пад кіраўніцтвам камуністаў. **Кіруючая роля кампартыі значна ўзмацнілася.**

Праз загароды фашыцкага тэрору ўсё шырэй прарываецца рух беспрацоўных, хваля якога заліває ўсю Польшчу, Заходнюю Украіну і Беларусь. Выключная актыўнасьць дэманстрацый беспрацоўных прымушае фашызм пускаць у ход, апроч патронаў, дэмагагічныя абяцаньні і мізэрныя падачкі пры адначасовым урэзваньні фонду дапамогі беспрацоўным. За апошні час фашыцкі ўрад высунуў праект прадстаўленьня работы беспрацоўным шляхам скарачэньня дзён і гадзін занятых рабочых, пры скарачэньні заработку.

Даведзеная да роспачы падаткамі і ліхварскімі даўгамі вёска прадстаўляе—паводле слоў буржуазных публіцыстаў—«кіпучы кацёл бяз кляпанаў бясьпекі». «У сувязі з усеагульным жабрацтвам,—піша Сьвентахоўскі,—зразумела небясьпека нейкага выбуху роспачы, узмацняньня элемэнтамі, што раскладаюцца, і ў гэтым становішчы знаходзяць магчымасьць сеяць зьнішчальную буру». Аналёгічны рух ахапіў шырокія масы сялянства ня толькі на Заходняй Украіне і Беларусі, але ў самой Польшчы. У наяўнасьці прыліў новай хвалі нацыянальна-вызваленчага руху народных мас. У той-жа час украінская і беларуская буржуазія прадаецца польскаму імпэрыялізму; вядуцца закулісныя перагаворы польскіх фашыстаў і украінскіх нацыянал-фашыстаў. Крывавая «пацыфікацыя» яшчэ больш абвострыла нацыянальна-вызваленчую барацьбу заходня-украінскіх мас супроць польскай акупацыі. Пачасьціліся сутычкі з паліцыяй і акупантамі. Зноў пачаліся падпалы. Узмацнілася барацьба нізоў супроць згодніцкіх верхаўін у культурна-нацыянальных арганізацыях, у каапэратывах і г. д.

Нарэшце, зьявіўся новы фактар—глыбокае **ўзрушаньне сярод дзяржаўных служачых,** якое будзе дапамагаць раскладаньню дзяржаўнага апарату. Сымпатыі да пралетарскай рэвалюцыі пачынаюць узьнікаць і сярод разбураных крызісам пластоў дробнай гарадзкой буржуазіі. Гэтыя сымпатыі асабліва выявіліся ў часе забастоўкі варшаўскіх трамвайшчыкаў. «Варшаўская газэта» з абурэньнем і непакоем пісала тады аб «паводзінах шырокай публікі, якая не спрабавала нават зламаць забастоўку, як гэта яна рабіла ў мінулыя гады».

Найбольш характарнай рысай пералому, які адбываецца ў настроях і сьвядомасьці мас, зьяўляецца **паскораньне зжываньне ілюзій, якія распаўсюджваюцца сацыял-фашыстамі і народніка-фашыстамі, аб мірным «дэмакратычным» выхадзе з крызісу.** Паказваны камуністамі шлях рэвалюцыйнага вырашэньня крызісу знаходзіць водгук у шырокіх масах. У ходзе штодзённай барацьбы звужаецца амплітуда хістаньняў мас, расьце і бакадзельнасьць. Таму ўсё больш слабеюць прывадныя рамяні фашыцкай дыктатуры да мас.

У паасобных—**праўда, яшчэ вельмі рэдкіх выпадках**—гэты працэс адбываецца бурным тэмпам. Яскравы прыклад дала забастоўка трамвайшчыкаў у Варшаве, якая выклікала нячуваны да гэтага часу разрыў паміж візамі і верхавінамі сацыял-фашыцкіх і фашыцкіх прафсаюзаў. Але гэты працэс ня прыняў яшчэ бурных разьмераў па ўсім фронце. Побач з развалам фашыцкай «рабочай партыі»—ППС існуе яшчэ масавы базіс ППС, якая ўзмоцненым манэўраваньнем часткова кампэнсуе падзеньне ўплыву і спрабуе стаць на чале мас, каб зьвярнуць іх з рэвалюцыйнага шляху. Тактыка падмену доўгай забастовачнай барацьбы аднадзеннымі дэманстрацыйнымі забастоўкамі часамі з некаторым посьпехам праводзіцца сацыял-фашыстамі. Сацыял-фашызм праявіў значную здольнасьць прыстасоўваць сваю фразэалёгію і тактыку да цяжкіх для яго ўмоў рэвалюцыйнага ўздыму.

Чым мацней няўпэўненасьць у лягеры фашызму, чым больш прыкметна нарастае крызіс верхавін пад уплывам эканамічнага развалу і клясавай барацьбы, якая ўсё больш абвастраецца, тым больш яскрава выступае роля сацыял-фашызму як апошняга рэзэрву і галоўнай сацыяльнай апоры буржуазіі.

III пленум ЦК КПП правільна падкрэсьліў, што «па меры рэвалюцыйнай хвалі магчымы яшчэ рад «дэмакратычных» манэўраў для адтаваньня дыктатуры буржуазіі, магчыма ўзьнікненьне розных новых зьнешніх форм фашыцкага рэжыму, розных дэкарацый для ашуканьня мас». Таму—згодна паказаньню XI пленуму Выканкому Камінтэрну—пленум ЦК КПП завастрыў увагу партыі на барацьбе за аўладань не масавымі апорнымі пунктамі сацыял-фашызму, народніка-фашызму, які спрабуе паралізаваць барацьбу сялянскіх мас у карэннай Польшчы, і нацыянал-фашызму, які імкнецца адцягнуць ад рэвалюцыйнай барацьбы працоўныя масы Зах. Украіны і За. Беларусі. Гэта задача стаіць зараз перад партыяй па-новаму. Камуністы павінны паскорыць працэс раскладаньня сацыял-фашызму. Намаганьні партыі павінны адказваць узросшым магчымасьцям ажыцьцяўленьня гэтай задачы. Гэта тым больш неабходна, што на глебе галавакружэньня ад посьпехаў у некаторых зьвяньнях партыі можа ўзьнікнуць недаацэнка існуючай небясьпекі сацыял-фашызму (падобныя сымптомы ёсьць, напрыклад, у дамброўскай арганізацыі).

Сучасную стадыю рэвалюцыйнага ўздыму характарызуе таксама ўсё мацней выступаючая ў ім **гегемонія пролетарыяту** пры хуткім выроўнываньні дыспрапорцыі паміж сялянскім рухам у Польшчы, на Заходняй Украіне і Беларусі. Гэта—адна з асноўных прадпасылак перамогі рэвалюцыі ў рашаючых цэнтрах панаваньня польскай буржуазіі.

Аднак слабым бокам рэвалюцыйнага руху, які ўсё шырэй прарываецца праз загароды фашыцкага тэрору, зьяўляецца далёка яшчэ не перасіленая раскіданасьць выступленьняў пралетарыяту і сялянства, а таксама паасобных частак рабочае клясы, перш за ўсё беспрацоўных і занятых рабочых. Рух беспрацоўных распылены. Удзел працуючых у дэманстрацыях беспрацоўных—мінімальны. Нарэшце, сельскагаспадарчы пралетарыят усё яшчэ моцна адстае ад агульнага рэвалюцыйнага руху рабочых і сялянскіх мас. **Па шырэньне масавага базісу руху і кардынаваньне яго важнейшых зьвеньняў** робіцца неабходнай умовай разгорнутага пераможнага наступленьня супроць фашыцкай дыктатуры, супроць усёй капіталістычнай сыстэмы.

«Хутка расьце,—гаворыць рэзалюцыя III пленуму,—баявы настрой у масах. Насьпяваюць стыхійныя выбухі, узьнікаюць новыя формы барацьбы, зьяўляюцца магчымасьці прарываў фашыцкага фронту ў найбольш слабых мясцох. На ўласным вопыце працоўныя масы ўсё шпарчэй падыходзяць да рашаючых боек за ўладу, за дыктатуру пралетарыяту».

Нарастаючы рэвалюцыйны крызіс, крызіс клясавага панаваньня буржуазіі, не аддзелены кітайскай сьцяной ад сучаснага рэвалюцыйнага ўздыму. Насьпяваньне яго прадпасылак адбываецца паскораным тэмпам. «Гэты крызіс,—падкрэсьлівае пленум ЦК КПП,—паставіць перад партыяй ва ўсёй шырыні за дачу **падрыхтоўкі і арганізацыі ўзброенага паўстаньня рабочых, сялян і салдат.** Ужо цяпер партыя павінна рыхтавацца да гэтых задач падвышэньнем баяздольнасьці сваіх радоў і ўзмацненьнем барацьбы за большасьць пралетарыяту».

***

Характар і напрамак дзейнасьці партыі ў сучасны пэрыяд пленум вызначыў лёзунгам: **«Праз штодзённую барацьбу да рашаючых боек за ўладу».** Гэта значыць, што ў сучасных умовах асноўным фактарам высьпяваньня рэвалюцыйнага крызісу зьяўляецца адпор, аказваны масамі атакам капіталу, паступовы пераход шырокіх мас пралетарыяту і эксплёатуемага сялянства ў рэвалюцыйнае контрнаступленьне. Пастаянная арганізацыя штодзённай барацьбы вакол непасрэдных патрэбаў пралетарыяту, сялянства і гарадзкой беднаты, пашырэньне фронту гэтай барацьбы, каардынаваньне руху працуючых і беспрацоўных, вывядзень не буйных мас на вуліцу, арганізацыя масавага адпору ўзброеным сілам фашызму, сутычка ў ходзе барацьбы нізоў з верхавінамі сацыял-фашыцкіх народніцка-фашыцкіх і нацыянал-фашыцкіх партый, пераход шырокім мільённым фронтам да вышэйшых форм рэвалюцыйнай барацьбы—гэткія асноўныя задачы, намечаныя III пленумам.

Для ўзьняцьця актыўнасьці партыі ў нацыянальна-вызваленчым руху пленум парашыў зрабіць паварот ад агульнай прапаганды да **мабілізацыі шырокіх народных мас** супроць усякіх напрамкаў нацыянальнага прыгнечаньня, супроць польскай акупацыі, за самавызначэньне аж-да аддзяленьня як праграму барацьбы за нацыянальнае вызваленьне. На гэтай аснове камуністы Заходняй Украіны і Беларусі па вінны ўцягнуць ў адзін фронт барацьбы супроць польскага імпэрыялізму, масы, якія ідуць яшчэ за нацыянал-фашыцкімі партыямі, адрываючы гэтыя масы ад правадыроў пад лёзунгам самавызначэньня нацыянальнасьцяй ад-жа аддзяленьня. Толькі такім чынам кампартыя зможа заваяваць шырокія масы прыгнечаных народаў як саюзьнікаў пралетарскай рэвалюцыі.

У ходзе штодзённай барацьбы за хлеб, працу і свабоду неабходна максымальна ўзмацніць арганізацыйны склад партыі і яе прывадныя рэмяні да мас, асабліва на буйных прадпрыемствах. Павінна быць цалкам і поўнасьцю выканана дырэктыва аб падваеньні колькаснага складу партыі. У найкаравацейшы тэрмін павінна быць дасягнута значнае ўзмацненьне рэвалюцыйных прафсаюзаў, апазіцыі ў сацыял-фашыцкіх і фашыцкіх саюзах рэвалюцыйнага прафруху.

«Кожная арганізацыя, кожная ячэйка, кожны член партыі,—напамінае пленум,—павінны цьвёрда ўявіць сабе, што наша актыўнасьць наша арганізацыйнае прасякненьне ў масы будуць вызначаць тэмп перарастаньня штодзённай барацьбы ў рашаючыя бойкі за ўладу». Таму партыя абавязана ўзмацніць барацьбу супроць усякіх праяў хвасьцізму, супроць правага апартунізму, як галоўнай небясьпекі і супроць «левага» апартунізму, супроць недаацэнкі сітуацыі і левых авантурніцкіх перасковаваньняў праз сучасны этап разгорнутай барацьбы за масы. Пад гэтым кутом погляду была зроблена ацэнка вопыту апошняга пэрыяду эканамічнай і палітычнай барацьбы, пасьлядоўная самакрытыка памылак і недахопаў партыі.

Каб паскорыць рэвалюцыйны выхад з крызісу, партыя ў сваіх выступленьнях высоўвае лёзунгі, якія каардынуюць рух мас, разьвязваюць іх баявую энэргію, стыкаюць іх непасрэдна з фашыцкім дзяржаўным апаратам, ставяць перад імі рубам пытаньне аб ўладзе і палягчаюць пераход да вышэйшых форм барацьбы. Гэткі характар мае цяпер лёзунг: **«Ні грошы падаткаў ураду голаду, беспрацоўя, тэрору і вайны».** Зьвязаная з імі антыпадатковая барацьба мабілізуе шырокія масы пралетарыяту, сялянства і гарадзкой дробнай буржуазіі на барацьбу супроць фашыцкай дыктатуры, супроць усёй капіталістычнай сыстэмы. Падобную ролю можа адыграць і лёзунг канфіскацыі сродкаў харчаваньня ў вялікіх магазынах і ў памешчыцкіх маёнтках. У вёсцы шырокая кампанія пад гэтым лёзунгам будзе разьвязваць барацьбу сялянскіх мас за канфіскацыю зямлі бяз выкупу. Гэткае-ж удзеяньне на масы можа аказаць лёзунг скарыстаньня сялянамі памешчыцкіх сенажацяй і лясоў. Імкненьне мас да больш вострых форм барацьбы супроць фашызму адказваюць лёзунгі, якія заклікаюць вызваляць гвалтам арыштаваных і разбройваюць фашыцкіх дружынынікаў. У меру насьпяваньня рэвалюцыйнага крызісу партыя павінна будзе завастрыць сваё лёзунгі і правадзімую пад гэтымі лёзунгамі барацьбу.

У галіне забастовачнага руху пленум зьвярнуў асаблівую ўвагу на разгортваньне масавых забастовак, увязаных з вулічнымі дэманстрацыямі, якія ахапляюць групу фабрык, цэлыя раёны і галіны прамысловасьці, забастовак, якія—**пры актыўнай ролі партыі**—будуць перарастаць ва ўсеагульную забастоўку, ахапляючы цэлыя вобласьці.

Пленум падкрэсьліў таксама вялізарнае значэньне масавых палітычных забастовак як зброі **барацьбы супроць ваеннай падрыхтоўкі польскага імпэрыялізму, у абарону СССР,** барацьбы, якая павінна стаяць у цэнтры ўсёй дзейнасьці партыі. Чым больш паглыбляецца крызіс капіталізму, тым больш настойліва буржуазія шукае выхаду на шляху контрэвалюцыйнай вайны супроць СССР. Палітычная рэзалюцыя пленуму, на аснове чоткага аналізу міжнароднага і ўнутранага становішча Польшчы, правільна сыгналізуе далейшы рост небясьпекі антысавецкай інтэрвэнцыі і неабходнасьці ўзмацненьня барацьбы з ёю. Зазначаючы на вялізарныя дасягненьні сацыялістычнага будаўніцтва ў процілегласьць развалу капіталістычнай гаспадаркі, пленум цесна ўвязаў лёзунг абароны СССР з прапагандай рэвалюцыйнага выхаду з крызісу.

Нарастаючы рэвалюцыйны крызіс у Нямеччыне ставіць перад партыяй задачу яшчэ больш цеснага, чым да гэтага часу, супрацоўніцтва з кампартыяй Нямеччыны.

Міжнародная буржуазія спрабуе адратаваць капіталістычную Нямеччыну ад пралетарскай рэвалюцыі. Гэта «адратаваньне» азначае яшчэ большае закабаленьне нямецкага народу, закутага ў ланцугі вэрсальскага дагавору. Нямецкая буржуазія ідзе на капітуляцыю перад французкім імпэрыялізмам, каб узмацніць свой клясавы фронт у барацьбе з рэвалюцыяй. Гэта непарыўна зьвязана з **арганізацыяй антысавецкага блёку** і будзе штырхаць нямецкую буржуазію на шлях кампраміс з польскім імпэрыялізмам.

Страх перад нямецкай рэвалюцыяй штырхае ў гэтым напрамку і польскую буржуазію, якая патрабуе адначасова гарантый недатыкальнасьці заходніх межаў Польшчы. «Памылковы погляд, які распаўсюджаны асабліва заграніцай,—піша орган пілсудчыкаў «Кур'ер Цодзённы»,—нібы Польшча жадала нацягнутых адносін паміж Францыяй і Нямеччынай. Мы ўсе жадаем стабілізацыі ў Эўропе. Мы ўсе разумем, што нямецка-французская згода азначае грэблю перад усякімі прозными ўскладненьнямі. У гэтым выпадку ўсе мы маем адну думку». Гэтую пазыцыю заняслі ў сойме прадстаўнікі ўсіх партый, пачынаючы з прадстаўніка ўрадавага лягеру—Мацкевіча, канчаючы сацыялістам Недзялкоўскім.

У гэтых умовах абавязкам кампартыі Польшчы зьяўляецца ўзмацненьне адзінага фронту **рэвалюцыйнай барацьбы пралетарыяту Польшчы і Нямеччыны.** Барацьба за зьнішчэньне ланцугоў вэрсальскай сыстэмы робіцца ўдарнай задачай нашай партыі. Яна азначае перш за ўсё корсткую барацьбу супроць пасмоў імпэрыялістычнай дзяржавы, як жандара гэтай сыстэмы ва ўсходняй частцы капіталістычнай Эўропы. У сувязі з гэтым буйнейшае значэньне набывае барацьба за вызваленьне прыгнечаных польскім імпэрыялізмам народаў, за зьнішчэньне польскай акупацыі, за вывад польскага войска і акупацыйнай ўлады, за поўнае права гэтых народаў на самавызначэньне аж да аддзяленьня ад польскай дзяржавы. Гэта мае дачыненьне ня толькі да Заходняй Украіны і Беларусі, але і да Верхняй Сілезіі, Данцыгскага калідору і да тэрыторый, населеных літоўцамі. Мы павінны ўжо цяпер растлумачыць працоўным масам, што пралетарская рэвалюцыя ў Польшчы і Нямеччыне азначае зьнішчэньне ўсёй вэрсальскай сыстэмы і заснаванага на ім будынку прыгнечаньня і эксплёатацыі. **Баявы саюз пралетарыяту Польшчы і Нямеччыны павінен зрабіцца сілай, якая ў цэнтры Эўропы нанясе сьмяротны ўдар прагніўшаму капіталізму.**

Пазыку „3-ці рашаючы" ў масы

ВЫТРЫМАЦЬ ЭКЗАМЕН

АФАРМЛЕНЬНЕ ПАДПІСКІ І СВАЯЧАСОВЫ ЎЗНОС ПЕРШЫХ ПЛАЦЯЖОЎ—ДРУГІ ВАЖНЕЙШЫ ЭТАП ПАЗЫКОВАЙ КАМПАНІІ

Дубровенская ашчадкаса дрэнна праводзіць рэалізацыю пазыкі

Кантрольных лічбаў па падпісцы на пазыку «3-ці рашаючы» Дубровенская гарашчадкаса ня выканала.

На Асінторфе—самым буйным прадпрыемстве раёну, да гэтага часу сядзеў і нічога не рабіў супрацоўнік касы **Касьцючэнка.** І вось, дзякуючы такому «працаўніку», Асінторф недавыканаў заданьня на 43 проц.

Толькі 9 жніўня гэты «актывіст» быў зьняты з пасады.

Надзвычайна слаба праходзіць падпіска на пазыку ў Чарнаручанскім, Цілевіцкім і асабліва ў Азерыцкім сельсаветах.

Прэзыдыумы гэтых сельсаветаў, а таксама праўленьні калгасаў не ўявілі сабе вялікай важнасьці пазыкі «3-ці рашаючы».

Ашчадкаса разам з РВК да апошняга часу мала зварочвалі ўвагі на пасьпяховае заканчэньне кантрольных заданьняў па мабілізацыі сродкаў.

Гэтыя ганебныя прарывы павінны накіраваць дзейнасьць усёй грамадзкасьці Дубровенскага раёну на ўдарныя тэмпы па рэалізацыі пазыкі.

Трэба адзначыць таксама і тыя ўстановы, якія перавыканалі кантрольныя заданьні.

Дубровенскія райком, міліцыя, ашчадкаса; яны далі 122 проц. выканаў ня.

Трэба ў практыку касы ўвесьці фор му наяўнага разьліку ў больш шырокім маштабе, чымся да гэтага часу вялося: на сёньня па наяўным разьліку разьмешчана ўсяго 2000 рублёў.

Прымаючы пад увагу, што Дубровенскі раён зьяўляецца прамысловым, трэба лічыць недастатковым мабілізацыю сродкаў па ўкладах.

На 5 жніўня было фізычных укладаў усяго 17.289 руб. 62 к. і юрыдычных—4.731 руб. 47 к. Гэта з самага пачатку дзейнасьці касы—з 6 ліпеня 1930 г.

Практыка паказвае, што пры дастатковым растлумачаньні аб важнасьці мабсродкаў можна дасягнуць добрых посьпехаў.

Кантрольнае заданьне па Дубровенскім раёне павінна быць выканана.

Макарэвіч.

Патрэбен рашучы пералом у рэалізацыі пазыкі

Шапялёўскі сельсавет па рэалізацыі пазыкі «3-га рашаючага» сярод калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкіх мас насельніцтва зусім нічога не зрабіў. На сёньняшні дзень сярод калгасьнікаў і аднаасобнага сэктару ні сельвет, ні камсамольская ячэйкі ніводнага сходу не правялі па растлумачэньні значэньня пазыкі «3-га рашаючага», на сёньняшні дзень сельсавет ня мае ніводнага процанту ў падпісцы пазыкі.

Апартуністычныя адносіны сельсавету і камсамольскай ячэйкі да рэалізацыі пазыкі «3-га рашаючага» сярод калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкіх мас давялі да таго, што падпіска на сутнасьці сарвана, неабходна гэту апартуністычную ўстаноўку, якая ёсьць у Шапялёўскім сельсавеце і камсамольскай арганізацыі, разьбіць, неадкладна мабілізаваць масы на рэалізацыю пазыкі «3-га рашаючага» сярод калгасьнікаў і аднаасобнікаў, вядучы самую рашучую барацьбу супроць кулака і яго агентаў падкулачнікаў, якія імкнуцца сарваць гэтую важнейшую кампанію, трэба павесьці шырокую растлумачальную работу сярод калгасьнікаў і аднаасобнікаў, з тым, каб кожны калгасьнік і аднаасобнік не застаўся-б без аблігацый пазыкі.

Шапялёўскі сельсавет і камсамольскія ячэйкі павінны ведаць лёзунг 100 проц. падпіскі сярод калгасьнікаў і аднаасобнікаў і ня менш 3-тыднёвага заработку.

Мядзьведзяў.



Майстар т. Камянецкі (зав. «Ударнік») знаёміцьмаладога рабочага з дэталямі станка.

Зламаць апартуністычны самацёк

Асьвея. (Белта). Ударны месячнік па рэалізацыі пазыкі скончыўся, а работа па рэалізацыі пазыкі ў Асьвейскім раёне не пачата.

Па ўсім раёне заданьне рэалізавана ўсяго на 13 проц. Замест ударнага распаўсюджваньня пазыкі ў Райфа панае злачынная апартуністычная стаўка на самацёк. Многія партыйныя ячэйкі не займаліся арганізацыяй рэалізацыі пазыкі і кіраўніцтвам яе не ахапілі.

Прымеце выклік

Я, селькор газэты «Савецкая Беларусь» Мікола Яроменка з Полацкага раёну, падпісваюся на пазыку «Трэцяга рашаючага году пяцігодкі» на 30 працадзён, якія абавязуюся адпрацаваць у сваёй камуне.

Выклікаю пасьледваць майму прыкладу селькораў: **Ц. Лявіцкага** (Сьміловіцкага р.), **Х. Магулёва** (Расонскі р.), **М. Грыдзюшку** (Вушацкі р.), **Я. Савіцкага** (Рагачоўскі р.), і **Трапэра** (Круглянскі р.).

Чакаю вашага адказу, праз газ. «Сав. Бел.».

Селькор-ударнік «Сав. Бел.»
Мікола Яроменка.

Яны перавыканалі заданьне

Падпіска на пазыку «3-ці рашаючы год пяцігодкі» праходзіць ў б. Капыскім раёне пасьпяхова. Кантрольная лічба 168 тысяч, у Капыскім раёне сустрэла з боку калгасаў, прадпрыемстваў і ўстаноў свае сустрэчныя павялічаныя пляны, дзякуючы чаму заданьне выканана на 110 проц.

Кожны калгасьнік паставіў перад сабой задачу падпісацца на пазыку ў суме месячнага заработку. Камсамольскія арганізацыі ішлі першымі ў рэалізацыі пазыкі. Старасельская ячэйка КСМБ падпісалася на 50 руб., прычым кожны калгасьнік яшчэ індывідуальна падпісаўся на месячны заработак.

Брыгада «С. Б.»: **А. Генін, Е. Росман.**

Не застанаўляцца на дасягненьнях

Віцебск. (Наш кар.). На 5 жніўня г. г. Даўжанскі сельсавет заданьне па рэалізацыі пазыкі 3 рашаючы год пяцігодкі выканаў на 113,5 проц., Старасельскі на 114,3 проц., Рудакоўскі—на 110,3 проц., Шумянскі—125,8 проц. Але супакоіцца на гэтым нельга, бо многія аднаасобнікі, а таксама і частка калгасьнікаў падпіскай на пазыку яшчэ не ахоплены.

Гэта абавязвае нас прыняць усе захады да таго, каб у бліжэйшыя дні ахапіць усіх аднаасобнікаў і калгасьнікаў падпіскай на пазыку.

Ударыць па апартуністых зрываючых пазыку

Шапялёўскі сельсавет даўно думае аб двух пытаньнях і ўсё іх «вырашае». Першае, гэта рэалізацыі пазыкі—«3 рашаючага году» і другое давесьці да кожнага кулацка-заможнага двара пляны асеньняй сяўбы.

Гэтыя два пытаньні па Шапялёўскім сельсавеце ня толькі не вырашаюцца, але зрываюцца самым старшынёй сельсавету.

РВК павінен паставіць з усёй рашучасьцю пытаньне перад працаўнікамі Шапялёўскага сельсавету. Гэтыя два надзвычайна важныя пытаньні павінны быць выкананы поўнасьцю, у самы хутчэйшы тэрмін, а калі працаўнікі Шапялёўскага сельсавету дзякуючы апартуністычнай недаацэнкі не жадаюць іх выконваць, дык зараз-жа трэба зрабіць арганізацыйныя вывады.

Брыгада «С. Б.» **Янка, Зося і Мікола.**

Змагацца за выкананьне пастаноў зьезду рабселькораў

ДА КЛІЧАУШЧЫНЫ НЕ ДАЙШЛІ ПАСТАНОВЫ ПАРТЫІ

АБ ПЕРАБУДОВЕ РАБСЕЛЬКОРАУСКАГА РУХУ

РАШУЧА ЎДАРЫЦЬ ПА АПАРТУНІСТЫХ, ЯКІЯ ЗРЫВАЮЦЬ ВЫКАНАНЬНЕ ПАСТАНОЎ ДРУГОГА ЎСЕБЕЛАРУСКАГА ЗЬЕЗДУ РАБСЕЛЬКОРАЎ

Там, дзе нізавы друк у загоне

Ужо многа раз узьнікала пытаньне на Клічаўшчыне аб выданьні сваёй раённай насьценгазэты і нават шматтыражкі з мэтай разгортваньня самакрытыкі, з мэтай асьвятленьня сапраўднага жыцьця і становішча раёну, змагацца з усімі хібамі бюракратызму і валакіты, пашкаджаючай сацыялістычнаму будаўніцтву і г. д.

У галіне арганізацыі сваёй газэты шмат разоў стаяла пытаньне у РК КП(б)Б, якім шмат разоў адзначалася неабходнасьць выданьня раённай газэты. Была нават абрана рэдакцыйная калегія. Але тут зрабілі «маленькую» памылку: адказным рэдактарам прызначылі старшыню Райпрафсавету т. **Маркоўскага.** Яму даручана было ня толькі займацца выданьнем райнасьценгазэты, але-ж і арганізаваць вакол газэты ўвесь рабселькораўскі актыў раёну, праводзіць з апошнім належную работу па ўцягненьні рабселькораў у раённую насьценгазэту, дабівацца таго, каб кожны рабселькор быў арганізатарам насьценгазэты ў сваім калгасе, вёсцы і ўстанове.

Але калі прыглядзецца да вынікаў работы, дык пастановы РК КП(б)Б засталіся пастановамі—**ў жыцьцё яны не праведзены.** Тав. **Маркоўскі** зусім забыўся (амо і зусім ня ведаў), аб вынятцы з дакладу тав. **Сталіна «Друк зьяўляецца самай вострай зброяй партыі»,** або ён не жадае падпарадкавацца пастановам РК КП(б)Б.

На сёньняшні дзень ў раёне насьценгазэты няма. Каля 2-х месяцаў назад з вялікімі цяжкасьцямі была выдана насьценгазэта, якая ня зусім адпавядала сучаснаму моманту ,бо яна ня была прыстасавана цалкам да задач раёну па сацыялістычным будаўніцтве і ніколькі не адбівала сапраўднага становішча ўсіх правадзімых палітычных кампаній на вёсцы. У газэце менш за ўсё было зьвернута ўвагі на ход калектывізацыі, падрыхтоўкі да веснавой сяўбы. Аб уборачнай кампаніі яшчэ няма і гуку ,бо да гэтага часу газэта ня выдана зусім. У ранейшым нумары таксама ня было аддана дастатковa месца ліквідацыі кулацтва, як клясы, клясавай барацьбе на вёсцы.

Як у райкоме КП(б)Б ,так і ў раённай рэдакцыі зусім няма вучоту раённага актыву і рабселькораў. Аб гэтым сьведчыць той факт, што Клічаўскія арганізацыі не знайшлі ў раёне ніводнага рабселькора, каб накіраваць на Ўсебеларускі зьезд рабселькораў. Райарганізацыі не пацікавіліся пытаньнем склікаць хоць-бы раённы зьлёт рабселькораў.

Арганізацыя насьценгазэт у калгасах, саўгасах і іншых гаспадарках і ўстанове зусім не разгорнута. А калі дзе і выдаецца ,дык яна не адпавядае сапраўдным сучасным запатрабаваньням. Адным словам, раённы друк зусім не разгорнут. Гэта спрыяе раду прарываў у рабоце па правядзеньні розных мерапрыемстваў на вёсцы, што грае на руку клясаваму ворагу. На сёньняшні дзень становішча барацьбы ў раёне з кулацтвам праведзена ня зусім дастаткова—маецца шмат кулакоў, якія змагі замаскавацца і пралезьці ў саўгаспадаркі.

Правадзімыя кампаніі па ўсіх відах загатовак праходзяць вельмі слаба і нават зрываюцца. Маюцца выпадкі, адліву з калгасаў. Прыклад: у вёсцы **Паплавы** з-за недастатковага разгортваньня працы ў гэту вёсну **вышла 36 гаспадарак з калгасу.** Гэта магло здарыцца толькі пад уплывам кулацкай агітацыі. А наш раённы друк не прыстасаваўся да таго каб чотка выкрыць усе кулацкія вылазкі і меру барацьбы з імі, а наадварот цягнецца ў хвасьце.

Прыклад з каапэрацыяй на Клічаўшчыне, дзе на працягу году раскрадаліся тавары з базы. Такое зьявішча мог-бы сваячасова зьнішчыць раённы друк, калі-б праз яго было разьвіта асьведамленьне працы каапэрацыі. Маюцца выпадкі, п'янства ў сельсаветах і нават забойства сялян адказнымі працаўнікамі сельсавету, (як прыклад: старшыня **Нясецкага сельсавету,** каля месяца таму назад, будучы вельмі п'яным, застрэліў падводчыка). Увесь склад Н. Максім

Выканаць рашэньні 2-га ўсебеларускага

Здаровы паравоз--рашаючая сіла асеньня-зімовых

Менскі чыгуначны вузел да перавозак не падрыхтаваны. Па віне Белкаапсаюзу, Саюзхлебу і МЦРК дзесяткі вагонаў прастойваюць ня выгружанымі. Кліентура не рыхтуецца да мэханізацыі пагрузачна-выгрузачных работ

„Пленум ЦК лічыць... недапушчальным нерацыянальнае скарыстоўваньне гасорганамі і каапэрацыйнымі арганізацыямі... транспарту..., затрымку рухавога складу пад пагрузкай і выгрузкай...".

(З рэзалюцыі чэрвеньскага пленуму ЦК УсеКП(б).

„Баявой задачай кожнага саюзнага органа, кожнага члена саюзу павінны быць падрыхтоўка і правядзеньня плянаў, намечаных у надыходзячыя асеньня-зімовыя перавозкі".

(З рэзалюцыі X зьезду чыгуначнікаў).

Рабселькоры--уключайцеся на барацьбу за бальшавіцкую падрыхтоўку да асеньня-зімовых

Менскі чыгуначны вузел да асеньня-зімовых перавозак не падрыхтаваны

Пастанова чэрвеньскага пленуму ЦК УсеКП(б) аб падрыхтоўцы да асеньня зімовых перавозак на Менскім чыгуначным вузле ня выконваецца.

Кліентура зрывае падрыхтоўку да перавозак. Брыгада ЦКК НК РСІ БССР зрабіла праверку рэалізацыі пастановы чэрвеньскага пленуму і пастановы ўраду СССР пра падрыхтоўку транспарту вузла да сустрэчы асеньня-зімовых перавозак і ўзаемадносінах з кліентураю, знайшла зусім недапушчальнае становішча.

Ня гледзячы на пастановы партыі і ўраду аб упарадкаваньні кліентураю пакгаўзаў і шляху, кліентура гэтай пастановы ня выконвае і гэтым самым зрывае падрыхтоўку да асеньня-зімовых перавозак. Галоўны ўпор труднасьцяй пры асеньня-зімовых перавозак заключаецца ў тым, што мэханізацыя на складах МЦРК, Белкаапсаюзу, Саюзтрансу, Нафтасындыкату, Прадмагу, Саюзхлеба і г. д. не праводзіцца.

Каля складаў стаіць па 20 нявыгружаных вагонаў. У складах кліентуры непарадкі, самі кіраўнікі складаў ня ведаюць як іх наладзіць. Выгрузка і пагрузка не мэханізаваны, рабочым грузчыкам прыходзіцца насіць мяшкі на сьпіне на трэці паверх, што затрымлівае работу і дрэнна адбіваецца на здароўі рабочых. Выгрузачнымі прыладамі склады не забясьпечаны.

Грамадзкасьць не аказвае дапамогі чыгунцы ў наладжваньні мэханізацыі. Чыгуначная адміністрацыя таксама большасьць сваіх аб'ектаў мэханізавала на станцыі Менск—пасажырскі і на станцыі Менск—таварная.

Для сустрэчы асеньня-зімовых перавозак неабходна выканаць будаўніцтва, да якога, яшчэ не прыступлена. ДП—11 і НОР—5 да сканчэньня будаўніцтва ніякіх захадаў ня прымае. Для павялічэньня разгрузачных пляцовак з павялічэньнем праходу грузаў, патрэбна было скласьці тупіковы шлях на таварнай станцыі, але і гэта ня зроблена. Абсталяваньне пляцовак для прыёму будаўнічых матар'ялаў каля базы Белжылсаюзу таксама ня зроблена.

Саюзхлеб добра ведае, што няма пакгаўзаў для прыёмкі збожжа, якое ўвосень хлыне на Менскі вузел для гораду, але месца ссыпкі, прыёму грузаў і складаў ня будзе. На базе МЦРК і Белкаапсаюзу не падрыхтавана месца для выгрузкі гародніны, а таксама тара і вагаметкі.

Такое зьявішча маецца і ў ТСТ, дзе месца для выгрузкі гародніны не падрыхтавана. Менскі ТСТ ня ведае дзе будзе сустракаць гародніну і дзе яе складаць, бо няма нават і складаў, хавальняў, для гародніны. Для пасьпяховасьці выкананьня асеньня-зімовых перавозак і адгрузкі гародніны ў мэтах забесьпячэньня дадатковага пляну па шляху чыгункі патрэбна было пабудаваць навес, гэта пытаньне было пастаўлена перад НДК—3, але навес і на сёньня не будуецца.

На ўноў пабудаваных, а таксама ў старых пакгаўзах і шляху не праведзена поўнасьцю асьвятленьне, а на ўноў адкрытых ня ўсюды ўстаноўлена і наладжана сувязь. Яшчэ горш абстаіць справа з асьвятленьнем у кліентуры, там зусім цёмна (як на Прадмагу, Саюзхлебе, Белкаапсаюзе, МЦРК, Саюзтрансе і інш.).

Маецца тэлеграф на станцыі, але ён зусім няпрыстасаваны да працы, апаратура старая і не адрамантавана, якая патрабуе замены новай, ДШ—10 добра ведае папсутасьць апаратаў, ведае неабходнасьць асьвятленьня і сувязі для асеньня-зімовых перавозак, але ён чамусьці маўчыць. Для таго каб забясьпечыць працу круглыя суткі па прыходу грузаў у часе перавозак неабходна зараз-жа правесьці як асьвятленьне, так і сувязь і апаратуру тэлеграфу.

Па пляну падрыхтоўкі вузла да асеньня-зімовых перавозак патрэбна было вылучыць пэрсанальна адказных асоб забясьпечваючых нармальную падачу вагонаў пад разгрузку і выгрузку па вузлу, якія-б кіравалі справай прыходу грузапатоку (звыш 200 вагонаў у суткі на ст. Менск) але і гэта не праведзена ў жыцьцё. Людзі ня вылучаны. На сёньня прыходзіцца канстатаваць, што штаб на Менскім вузле да асеньня-зімовых перавозак таксама ня створаны, адсутнічае кантроль праверкі гатоўнасьці вузла да асеньне-зімовых перавозак, няма ніякай дагаворанасьці паміж вузлавымі арганізацыямі, а таксама і кліентурай.

Плян мерапрыемства для правядзеньня асеньне-зімовых перавозак па Менскім вузле складзены, але гэты плян не забясьпечвае поўнае выкананьне дадзеных партыяй дырэктыў і дырэкцыяй дарогі. Плян павінен быць складзен абхваціўшы ўсе галіны адказнікі цэхі і брыгады вузла, усебакова абмяркован і даведзен да кожнага рабочага і варштату, але на сёньня патрэбна канстатаваць, што гэтага няма.

Па пляну не ўнесена і не ўлічана прапускная здольнасьць, ня гледзячы на тое, што паравозны і пасажырскі парк на спаравую язду поўнасьцю не перайшлі, абязьлічка не ліквідавана.

Вымернікі выкарыстаньня рухомага складу не складзены, сярэдня-сутачны прабег таварнага паравозу не ўстаноўлены. Нормы прабега кандуктарскіх паравозных брыгад і змазчыкаў таксама не ўстаноўлены, і не даведзены да кожнага рабочага-чыгуначніка.

Партыйны, прафэсыянальны і камса молскі калектыў за выключэньнем калектыву эксплёатацыі не прымаюць актыўнага ўдзелу ў падрыхтоўцы да перавозак, нават і не абгаворвалі гэтага пытаньня.

Пры такой падрыхтоўцы, якая ёсьць на Менскім чыгуначным вузле і дрэнных адносін кліентуры, асеньне-зімовым перавозкам пагражае зрывам.

Партарганізацыя, праф. і камсамольская арганізацыя павінны па бальшавіцку ўзяцца за выкананьне пастаноў партыі, падначаліўшы актыўнасьць мас, накіраваўшы іх на выпрашэньне чарговых задач стаячых перад транспартам у часе асеньня-зімовых перавозак.

Мельнікаў.

Ліквідаваць абязьлічку, укараніць 100 процантную спараную язду

На Менскім чыгуначным вузле, ня гледзячы на пастановы партыі і ўраду аб правядзеньні спаранай язды, гэта мерапрыемства на ўсе 100 процантаў і да гэтага часу яшчэ не праведзена па ДЭПО—таварная і таварна-пасажырскага парку.

Брыгада ЦКК НК РСІ БССР зрабіла праверку і выявіла шмат ганебных фактаў перашкаджаючых наладзіць спараную язду, але ня гледзячы на гэта, агідныя факты ня толькі ня зьнішчаюцца, а наадварот павялічваюцца.

Недастаткова разгорнута на Менскім чыг. вузле сацспаборніцтва і ўдарніцтва паміж брыгадамі прымацаванымі да паравозу ў цэлым і асобных яго частках, ёсьць паравозы да якіх не прымацаваны брыгады, а калі яны і прымацаваны, дык гэтыя брыгады перамяньваюцца.

Няма належнага пералому ў рабоце машыністаў, качагараў, памочнікаў машыністаў, яшчэ на сёньня панує безгаспадарчасьць у рабоце з паравозам.

Лепшыя ўдарнікі-машыністы, паравозныя брыгады ня прэміруюцца за лепшае правядзеньне спаранай язды і за лепшы дагляд за паравозам. Умовы неабходныя для нармальнай працы брыгад не наладжаны. Карткі ўдарніка няма.

Менскае ТСТ яшчэ не загатовіла сьпікаў ударнікаў.

Менскае ТСТ не перабудавала свае працы згодна пастановы ЎсеКП(б), парт'ячэйка ТСТ па апартуністычнаму кіруе працаю і перабудоваю каапэрацыі.

Праўленьне ТСТ увесь час сабатуе пастановы партыі і ўраду а перабудове каапэрацыі; бюро парт'ячэйкі ТСТ сваім апартуністычным кіраўніцтвам спрыяла гэтаму. У выніку атрымалася, што паравозныя брыгады недаатрымліваюць прадуктаў (тлушчы, сыр, махорку).

Партарганізацыі цягі, цэхячэйкі паравозьнікаў, у асаблівасьці бюро, без належнай ўвагі адносяцца да правядзеньня спаранай язды, кожны камуніст не зьяўляецца лепшым змагаром перад беспартыйнымі ў правядзеньні спаранай язды (Жданові, Вычкоўскі, Купрэяў і інш.).

Гэта тлумачыцца адсутнасьцю належнай выхаваўчай працы сярод рабочых чыгуначнікаў па Менскім чыгуначным вузле. Гаспадарнікі, прафсаюзныя арганізацыі яшчэ не павярнуліся тварам да здаровага паравоза, прымацованай брыгады да правядзеньня спаранай язды і ліквідацыі абязьлічкі.

Вывучэньнем спаранай язды ніхто не займаецца. Інжынэрна-тэхнічныя сілы, гаспадарнікі ДЭПО, прафэсыянальныя і партыйныя арганізацыі павінны зараз-жа заняцца справай 100 працэнтнага правядзеньня спаранай язды і ўзяцца сапраўды па бальшавіцку за ўкараненьне яе.

Адсюль вынік, што не замацованая спараная язда, якая на працягу ўсяго часу на Менскім вузле праводзіцца слаба, будзе мець адбітак на працы ў часе правядзеньня асеньня-зімовых перавозак, тармозіць хутчэйшае наладжваньне паравознага і пасажырскага парку.

Неабходна выкарчаваць рэшткі апартуністычнага кіраўніцтва ДЭПО, разьбіць сабатаж ТСТ, прыцягнуўшы да суровай адказнасьці зрываючых спараную язду.

М.

На станцыі Ельск панує безгас падарчасьць

Начальнік станцыі Ельск Сінягуб ня цікавіцца даручанай яму працай. Сінягуб, карыстаючыся фактамі незалежных ад яго паасобных недахопаў, нядбайна адносіцца да свае работы асабліва па адпраўцы грузу.

Былі выпадкі, калі на станцыі Ельск ляжала шмат сена і саломы для ваенведу, вугалю і дубовай кары для гарбарняў, шкіпідару і інш., але Сінягуб не клапаціўся, каб сваячасова адгрузіць гэты залеж, які валяўся на станцыі па 6-7 месяцаў. Сінягуб адно цьвярдзіць: «Я не вінаваты, гэта такія парадкі ў цэнтры» і г. д.

Нядаўна высьветлілася, што 40—60 вагонаў стаялі па двое сутак, а потым прабеглі паражняком. Такая бесгаспадарчасьць мяжуецца з яўным шкодніцтвам.

Адпойчы у вагоне адвязалася жывёла, патрэбны былі сьвечкі ці ліхтары, каб пры сьвеце прывязаць яе. Правадзінікі зьвярнуліся да начальніка станцыі. Сінягуба, але ён не дапамог. Нагул, калі рабочыя пачынаюць што-небудзь выпраўляць у рабоце Сінягуба, дык ён з крыкам накідаецца на іх, як на «правапарушнікаў».

Мы сыгналізуем і патрабуем, каб на станцыі Ельск зараз-жа была зьнішчана злачынная безгаспадарчасьць.

«Пражэктар».

Абагульваем увесь азімы і яравы клін

Калгас імя 1-га мая, Бягомльскага раёну, першым па сельсавеце абагуліў увесь азімы і яравы клін і пастанавіў калектыўна засыпаць насенны і страхавы фонды.

Уборка сенажаці некалькі зацягнулася, да гэтага часу скошана ўсяго 90 проц. Усе калгасьнікі падпісаліся на пазыку імя «трэцяга рашаючага году пяцігодкі» ў разьмеры трохтыднёвага заработку.

П. Бараноўскі.

Партыйнае будаўніцтва

Прыклад канкрэтнага парткіраўніцтва

ўборачнай і падрыхтоўкай да асеньняй сяўбы, паказвае Клімавіцкая і Ельская партарганізацыі

На гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, на ўшчыльненьне тэрмінаў уборкі, на рашучае разгортваньне зяблевага ворыва і асеньняй сяўбы—накіраваць дзейнасьць сельскіх партарганізацый

Сталай бальшавіцкай работай забясьпечыць далейшыя посьпехі

(Папярэднія вынікі работы партаргпрапгруп)

Вылучаная РК КП(б)Б аргпрапгрупа з удзелам камсамольскага і прафактыву, паставіла перад сабой зусім яскравую і чоткую задачу—дапамагчы перабудаваць арганізацыйна-масавую работу ўсіх нізавых зьвеньняў партыйна-камсамольскай, савецкай і каапэрацыйна-калгаснай сыстэмы па Клімавіцкім раёне, пад кутом гледжаньня абслугоўвальня бягучай ўборачнай кампаніі і завяршэньня суцэльнай калектывізацыі. У выніку фактычнай праверкі і самаправеркі работы ў адзначаным напрамку ў Гусарскім, Дамамэярыцкім, Хатовіцкім і Кісялёва-Будзянскім сельсаветах, група выявіла шмат агіднейшых зьявішч, якія ня толькі не рашкаджалі правядзеньню важнейшых чарговых палітычна-гаспадарчых мерапрыемстваў, але нават пагражалі зрывам некаторых з іх.

Пытаньні зьдзельшчыны да гэтага часу яшчэ не атрымалі свайго рэальнага вырашэньня. Ня ўсюды яшчэ разданы калгасьнікам працоўныя кніжкі; не даведзены поўнасьцю да калгасьнікаў нормы выпрацоўкі, існуе апартуністычная недаацэнка зьдзельшчыны.

Плян жывёлагадоўлі зрываецца

У выніку адсутнасьці пэрсанальнай адказнасьці за даручаную работу дзякуючы самацёку і падзёншчыне, асабліва на такіх работах, як будаўніцтва сласных ям і сьвінарніжаў, у выніку адсутнасьці сталага тэхнічнага нагляду і кіраўніцтва гэтай работай—плян жывёлагадоўлі пад пагрозай зрыву. Так: у калгасах «Барацьба» замест 12 ям пабудавана толькі 2, у калгасе «Зьвязда» замест 9—адна, па Гусарскім сельсавеце замест 8--3, паХатовіцкім замест 21—4.

Будаўніцтва сьвінарніжаў фактычна спынілася. Прычыны гэтага—адсутнасьць цьвікоў. Дырэктыва РК аб тым, каб не чакаць цьвікоў, а накрыць сьвінарнікі саломай—не даведзена да рабочых і ў жыцьцё не праводзіцца. Адказных за будаўніцтва сьвінарніжаў і сілосных ям ня вызначана. Тэхнік Райкалгассаюзу быў толькі адзін раз з пачатку плянаваньня будынкаў.

Падрыхтоўка да асеньняй сяўбы не разгорнута

Ня гледзячы на тое, што тэрмін уборкі сенажаці даўно ўжо скончыўся, сенаўборка цалкам ня скончана. Падрыхтоўка да асеньняй сяўбы таксама яшчэ не разгорнута, пляны не даведзены да калгасьнікаў і аднаасобнікаў (Пянькоўка). Не распачата зяблевая запашка. Масавая палітвыхаваўчая праца вакол уборачнай кампаніі і падрыхтоўкі да асеньняй сяўбы не вядзецца.

Варожы элемэнт кіруе калгасам

Найбольш яскравым прыкладам адсутнасьці цьвёрдага бальшавіцкага кіраўніцтва могуць быць наступныя факты. Пад уплывам кулацкай агітацыі калгасьнікі разабагулілі жыта (Сьвіраль, Кулящоўка). Аднаасобнікі ня прыступілі да ўборкі сенажаці (Пянькоўка). Кіраўніцтва калгасу «Ільліч» (Хатовіцкага с.-с.) фактычна знаходзіцца ў руках клясавага ворага. Вось хто фактычна кіраваў калгасам: Марозаў Васіль (брыгадзір). Да ўступленьня ў калгас меў 5 кароў, некалькі коняй, веялку, малатарню, спэкулявай хлебам, карыстаўся наёмнай сілай. Паўлючэнка Віктар (былы дзяк), (палявод). Ганжажараў Мануіл—былы паліцэйскі, пазбаўлены выбарчых правоў, меў два з паловаю надзелы зямлі і моцную гаспадарку, якую ён разбазарыў пры ўступленьні ў калгас. Апенька Ляксей—меў 4 каровы, 2 кані, два надзелы зямлі і 5 га сенажаці. За хаваў у 1930 г. у лесе ад загатовак хлеб, пяньку і інш.; кідаўся да члена праўленьня калгасу з сякерай. Мелькоў Уладзімер (старшыня рэв. камісіі) былы царскі фэльдфэбэль, меў 2 кані, 2 каровы. Усю сваю «карысную» дзейнасьць у калгасе падпарадкаваў прыцыпу «сьвяшчэннай ўласнасьці».

Вынікі праверкі

Правёўшы масавую арганізацыйна-агітацыйную работу на працягу першай пяцідзёнкі ўдарнай дэкады аргпрапгрупа даблася пэўных рэальных вынікаў: а) эжатае паасобку калгасьнікамі вёскі Сьвіраль азімае жыта імі дабрахвотна здана ў калгас; б) разабагуленае і зьвезенае з поля па сваіх гумнах жыта ў калгасе «Ільліч» калгасьнікамі дабрахвотна здана зноў у калгас; в) вычашчаны з калгасу «Ільліч» чужы элемэнт; г) пераабрана праўленьне калгасу «Ільліч»; д) маецца прылёў у калгас бядняцка-серадняцкай часткі вёскі Пянькоўка, вышаўшай арганізавана на ўборку сенажаці; е) работа па будаўніцтву сласных ям і будаўніцтву сьвінарнікаў зрушана і ёй наданы сапраўдныя бальшавіцкія тэмпы; ж) пытаньне зьдзельшчыны і ліквідацыя абязьлічкі атрымала яскравае эразуменьне ў масе калгасьнікаў. Створаны належныя ўмовы, забясьпечваючыя хутчэйшае ажыцьцяўленьне сапраўднай зьдзельшчыны.

Вопыт арганізацыі аргпрапгруп, як сыстэмы новых мэтадаў работы і кіраўніцтва, сябе цалкам апраўдаў, аргпрапгрупа дапамагла ўноў арганізаванаму сельпарткому ў хутчэйшай і правільнай арыентацыі па выкананьні чарговых палітычна-гаспадарчых задач. Неабходна гэты вопыт пашырыць і далейшай ўпартай бальшавіцкай работай замацаваць атрыманыя вынікі.

В. Бальзоўскі.

Аб узмацненьні кадрамі загатоўчага апарату

Пастанова Сакратарыяту ЦК КП(б)Б

Улічваючы вялізарнае гаспадарча-палітычнае значэньне загатоўчай кампаніі, сакратарыят ЦК КП(б)Б пастанаўляе:

1. Прапанаваць усім РК КП(б)Б і РВК неадкладна праверыць становішча апарату загатоўчай сыстэмы і прыняць рашучыя меры па іх узмацненьні, як кіруючымі, адказнымі работнікамі, а таксама і рахункавымі работнікамі. У прыватнасьці ЦК КП(б)Б прапануе не пазьней 20-га жніўня зьвярнуць у загатоўчыя апараты і ў першую чаргу у Белхлебжыўсаюз неабходных для загатоўчага апарату работнікаў, як я раней працавалі ў загатоўчай сыстэме і катэгарычна забараніць да 1 студзеня 1932 году якую бы-та ні была перакідку і мабілізацыю работнікаў бяз згоды загатоўчай сыстэмы.

2. Прапанаваць Аддзелу Кадраў ЦК у дэкадны тэрмін накіраваць 5 адказных работнікаў для ўзмацненьня Белхлебжыўсаюза.

3. Прапанаваць Клімавіцкаму, Жыткавіцкаму, Касьцюковіцкаму, Лоеўскаму, і Камарынскаму РК КП(б)Б у 3-х дзённы тэрмін вылучыць адпаведныя кандыдатуры на пасады старшынь Райкаапсаюзаў сваіх раёнаў. У гэты-ж тэрмін Барэзінскаму, Нараўлянскаму, Каралінскаму, Быхаўскаму; Заслаўскаму, Стара-дарожскаму, Чырвона-Слабодзкаму і Жыткавіцкаму РК КП(б)Б вылучыць намесьнікаў старшынь райкаапсаюзаў сваіх раёнаў.

4. Адзначыць, што ЦК ЛКСМБ да гэтага часу па выкананьні дырэктыў ЦК УсеЛКСМ аб мабілізацыі 275 чалавек ячэйковага камсамольскага актыву для Белхлебжыўсаюзу, прапанаваць пад асабістую адказнасьць т. Палякова выканаць гэтую дырэктыву ў 5-ці дзённы тэрмін.

5. ЦК КП(б)Б яшчэ раз папярэджвае ўсе партыйныя і савецкія арганізацыі, што палітычнае і эканамічнае значэньне загатоўчай кампаніі патрабуе ўсямернай мабілізацыі сіл і сродкаў на ўзмацненьне загатоўчай сыстэмы і папярджвае, што недаацэнку значэньня гэтых мерапрыемстваў будзе разглядаць, як апартуністычную недаацэнку вялікага гаспадарча-палітычнага значэньня загатоўчай кампаніі.

6. ЦК КП(б)Б абавязвае ўсе РК КП(б)Б і РВК ня менш 2-х раз у месяц заслухоўваць даклады аб ходзе разгортваньня загатоўчай кампаніі, становішча апарату загатоўчай сыстэмы з прынцыпам усіх неабходных і рашаючых мер, даводзячы аб гэтым да ведама ЦК КП(б)Б.

Скараднянскі сельпартком разгортвае работу

ЕЛЬСК. (Наш кар.). 1 жніўня Скараднянскі сельпартком, Ельскага раёну, зрабіў першае паседжаньне сельпартарганізацыі па пытаньні канкрэтных мерапрыемстваў удзелу сельпарт арганізацыі ва ўборачнай кампаніі.

Падагульваючы папярэднія вынікі ўборачнай кампаніі, сельпартком рашуча паставіў пытаньне аб поўнай перабудове далейшай работы сельскіх ячэек у галіне канкрэцізацыі кіраўніцтва ўборкай і падрыхтоўкай да асеньняй сяўбы.

Сельпартком прызнаў, што парт'ячэйкі ў асноўным пасьпяхова спраўляюцца з уборачнай кампаніяй, у выніку чаго да 1 жніўня поўнасьцю скончана ўборка па 19 калгасах 4-х сельсаветаў. Адначасова было падкрэсьлена рад прарываў, якія яшчэ і зараз маюць месца ў працы ў цэлым радзе калгасаў.

Сельпартком вынес пастанову—з 1-га па 10 жніўня абвясьціць дэкаду штурму для ліквідацыі паказаных недахопаў і для поўнай перабудовы работы партыйных і камсамольскіх арганізацый.

Для ажыцьцяўленьня намечаных работ сельпартком выпрацаваў практычны плян на дэкаду. У аснову работы «дэкаднік» ўзяты наступныя пункты: да 10 жніўня скончыць абавязкова сенаўборку як у калгасах, так і ў аднаасобным сэктары; абавязкова скончыць за 10 дзён будаўніцтва сілосных вежаў, а таксама засіласаваць 30 проц. пляну згодна заданьня; да 10 жніўня скончыць перавод усіх калгасаў на сапраўдную зьдзельшчыну, наладзіўшы вучот работы.

Не пазьней 10 жніўня сельпартком рашыў скліканць куставую нараду раб селькораў і сьценкораў па пытаньнях поўнай рэалізацыі пастаноў 2-га Ўсебеларускага зьезду рабселькораў.

Райпартком у адказ на выклік Сангонаўскай ячэйкі КП(б)Б паставіў сваёй мэтай поўнасьцю рэалізаваць пастанову рабселькораўскага зьезду і ў кожным калгасе арганізаваць палявыя газэты, якія павінны работаць да поўнага сканчэньня ўборачнай і асеньня-пасеўнай кампаніі.

Герасіменка.

Замест кіраўніцтва—бязьдзейнасьць

Саўгас «Лекерта» (Менск, прыгарад) зьяўляецца аднэй з буйнейшых прыгарадных гаспадарак. У саўгасе ёсьць партыйная ячэйка ў складзе 12 членаў і кандыдатаў партыі. Здавалася-б, што пры такім складзе партыйных сіл саўгас павінен быў-бы зьяўляцца адным з перадавікоў бальшавіцкай сяўбы і ўборачнай. Аднак, дзякуючы таму, што парт'ячэйка яшчэ не перабудавала сваёй работы, не павярнулася да вытворчасьці, не ўзьняла актыўнасьці мас, у саўгасе меўся рад прарываў у вясеньняй сяўбе і ў падрыхтоўцы да ўборачнай. Бюро ячэйкі ня цікавіцца пытаньнямі вытворчага характару.

У выніку гэтага, па сутнасьці правааапартуністычнага кіраўніцтва з боку парт'ячэйкі дрэнна працуюць рабфак і грамадзкія арганізацыі. Пытаньне зьдзельшчыны, гаспадарчага разьліку да кожнага рабочага і работніцы не даведзены. На палявых работах зьдзельшчына зусім адсутнічае. Рабочыя не разьбіты на брыгады. Дырэктар саўгасу Бурак і старшыня рабочыя Мяц і Лютарэвіч нават ня ўлічваюць работы за дзень кожнага рабочага.

Гарком КП(б)Б павінен зацікавіцца гэтай парт'ячэйкай і ажывіць яе працу.

Камсамолец.

Напярэдадні навучальнага году

ВЫКАНАЦЬ ПЛЯН ШКОЛЬНАГА БУДАЎНІЦТВА

Сваячасова забясьпечыць школы праграмамі, падручнікамі і палітэхнічнымі прыладамі

У Гомелі і Аршаншчыне апартуністы зрываюць падрыхтоўку да навучальнага году Па-баяваму рыхтавацца да навучальнага году—значыць змагацца за ажыцьцяўленьне дырэктывы ЦК КП(б)Б.

Культармейцы Барэзінскага раёну ў барацьбе за падрыхтоўку да навучальнага году

Зьлёт культармейцаў Барэзінскага раёну ў мэтах сваячасовай падрыхтоўкі да новага навучальнага году і ўзьняцьця на належную вышыню палітасьветнай работы пастанавіў зрабіць наступнае:

Усе культармейцы абвясьцілі сябе ўдарнікамі па ліквідацыі няпісьменнасьці і малапісьменнасьці сярод усіх прызыўнікоў раёну.

Да 20 жніўня скончыць рамонт, новае будаўніцтва; забясьпечыць апалам, асьвятленьнем і абсталяваньнем усе школы, для чаго мабілізаваць грамадзкія сродкі і сілы для заканчэньня гэтай работы. Пастаноўлена да 20-га жніўня пры кожнай школе ўста навіць катлы і бакі для арганізацыі гарачых сьнеданьняў, распачаць работу сярод калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкага сялянства па загатоўцы прадуктаў для гарачых сьнеданьняў. Пастаноўлена таксама неадкладна закончыць вучот няпісьменных і малапісьменных, вызначыць сетку ліквпунктаў і забясьпечыць іх памяшканьнямі і адпаведнымі кадрамі.

Зьлёт культармейцаў пастанавіў скласьці адзіны культплян і ўсе хатычытальні рэарганізаваць у дамы сацкультуры, мабілізаваўшы грамадзкасьць на іх рамонт.

Брыгадзір «С. Б.» і НКА Куцанаў.

У Аршаншчыне яшчэ не разгорнута барацьба за ажыцьцяўленьне дырэктыў ЦК КП(б)Б

ВОРША. (Наш кар.). На Аршаншчыне падрыхтоўка да новага навучальнага году ідзе чарапашымі тэмпамі. Райінспэктарыят асьветы вельмі слаба кіруе падрыхтоўкай, спадзяючыся, што і так усё будзе гатова, што гэта зробяць сельсаветы і настаўніцтва. На справе атрымліваецца зусім іншае. Сельсаветы за справай падрыхтоўкі да новага навучальнага году зусім ня сочаць. Настаўніцтва ў большасьці сваёй зараз адпачывае і таксама спрамамі падрыхтоўкі да новага навучальнага году не займаецца. У выніку, на Аршаншчыне яшчэ нават не праведзены поўнасьцю вучот дзяцей школьнага ўзросту, вучот малапісьменных і няпісьменных.

Справа з рамонтам і пабудовай новых школ таксама прымушае біць трывогу. Будкантора, якая вя... будаўніцтва, ня можа скончыць апошняе ў тэрмін, бо райвыканкомам ня былі сваячасова загатоўлены матэрыялы, не хапае і рабочай сілы. Рабочыя, якія заняты на пабудове школ, прадуктамі і прамтаварамі амаль не забясьпечваліся зусім і, дзякуючы гэтаму, пераходзілі на іншыя будаўнічыя работы, дзе лепш снабжалі. Пабудова сямігодкі пры заводзе «Чырвоны Кастрычнік» распачата яшчэ ў мінулым годзе, але ідзе такімі марудными тэмпамі, што цяжка сказаць, ці будзе школа пабудавана да канца пяцігодкі.

Рамонт школ таксама ідзе марудна. Многія настаўнікі ў адпачынку, а сельсаветы ня думаюць самі распачаць рамонт. Настаўнікі зьвернуцца ў школы ў канцы жніўня і, такім чынам, толькі тады пачнецца рамонт школ, калі ўжо пара будзе пачынаць заняткі.

У радзе сельсаветаў, як напрыклад у Рудкаўскім і Стайкаўскім, сельспажыўтаварыствы ня выконваюць дырэктыў партыі аб забесьпячэньні настаўніцтва,—выдаюць прадукты і прамтавары вельмі нерэгулярна. Гэтыя недахопы ў снабжэньні выклікаюць лятуства сярод настаўнікаў.

Трэба справай падрыхтоўкі да навучальнага году на Аршаншчыне зацікавіцца раённай КК-РСІ, праверыць гэту работу і вінаватых у зрыве прыцягнуць да адказнасьці. Адначасова з гэтым раённыя арганізацыі павінны мабілізаваць увагу працоўных мас і ўзьняць іх на барацьбу за ажыцьцяўленьне дырэктыў ЦК КП(б)Б, на баявую падрыхтоўку да навучальнага году.

А. Калюжны.

У Гомлі падрыхтоўка прадастаўлена самацёку

Ня гледзячы на тое, што «Савецкая Беларусь» яшчэ ў маі месяцы распачала кампанію за баявую падрыхтоўку да новага навучальнага году, у Гомлі ў гэтых адносінах дагэтуль панує паўнейшы самацёк. Рамонт школьных будынкаў па віне будканторы амаль сарваны. Гомельскі ЦРК, ДТСТ да сёньняшняга дню ня маюць пляну забесьпячэньня вучняў вопраткай, абуткам і харчаваньнем. На лепш рыхтуецца да новага навучальнага году і Гомельскае аддзяленьня Белдзяржвыдавецтва.

Зусім нядбайныя і апартуністычныя адносіны ў падрыхтоўцы да новага навучальнага году назіраюцца з боку гарадзкога праўленьня саюзу Працасьветы. Палец ад палец яно ня ўдарыла, каб мабілізаваць армію культармейцаў, рабочых і калгасьнікаў на гэтую справу. Такія нядбайныя адносіны і стаўка на самацёк у падрыхтоўцы да новага навучальнага году павінны быць за раз-жа ліквідаваны.

Трэба з усёй рашучасьцю ўдарыць па апартуністычнай недаацэнцы палітычнага значэньня сваячасовай падрыхтоўкі да новага навучальнага году. Праўленьню саюзу працасьветы трэба зараз-жа шляхам вылучэньня брыгад узяцца актыўна за дапамогу мясцовым арганізацыям і ўстановам у падрыхтоўцы да навучальнага году.

Гомельскія асьветнікі.

Ліквідаваць прарывы ў школьным будаўніцтве

Падрыхтоўка да новага навучальнага году па Мазырскім раёне зрываецца. Па Даманавіцкім сельсавеце яшчэ не распачат рамонт школ. Старшыня сельсавету т. Сапацёнак кажа: «пабудуем і парамантуем, як будуць грошы».

У. в. Сельцы другі год стаіць зруб пад аднакамплектавую школу. У в. Бабровіч гніе матар'ял на школу пад адкрытым небам. Вінаватыя ў зрыве школьнага будаўніцтва павінны быць прыцягнуты да адказнасьці. Разам з тым, трэба прыняць усе захады, каб закончыць да пачатку навучальнага году рамонт школ і ўзяцца па баявому за новае школьнае будаўніцтва.

Н. О.



Сямігадовая школа ў м. Ельску (Ельскі р-н), пабудова яе каштавала 225.000 р.

За зрыў пабудовы школы да адказнасьці

У. в. Вакары б. Багушэўскага раёну, пачала ў 1929 годзе будавацца школа. Дзякуючы нядбайнасьці Аршанскага Жылбуду (з якім Багушэўскі РВК заключыў на пабудову дагавор і выплаціў грошы яшчэ з бюджэту 1930 году),—школа да гэтага часу ня скончана. Матар'ял і сьцены гніюць. Галоўнай віной і тормазам у іх несканчэньні пабудовы школы зьяўляецца дзясятнік Аршанскага Жылбуду тав. Бабцоў, які аб пабудове не клапоціцца, а гуляе з дачніцамі па сасьняку і атрымлівае пэнсію. Школа будуецца ў раёне трох калгасаў. Калгасьнікі згодны дапамагчы скончыць пабудову, але Бабцоў іх ашукаў і многім за работу не заплаціў.

Трэба Аршанскаму РВК і Жылбуду зьвярнуць на гэта ўвагу і прыцягнуць вінаватага ў зрыве пабудовы школы да адказнасьці.

Селькор «Свой».

Не паслабляць тэмпаў школьнага будаўніцтва

У галіне падрыхтоўкі да новага навучальнага году Парыцкі раён мае некаторыя посьпехі. Па раёне будуецца 7 новых школ, большасьць якіх пабудаваны ўжо на 80-90 проц. Прэзыдыум РВК даў дырэктывы скончыць школьнае будаўніцтва не пазьней 1-га кастрычніка. Складзены каляндарны плян будаўніцтва і створаны сталы кантроль за яго выкананьнем. Работу тармозіць недахоп цэглы і цьвікоў, але райвыканкомам прыняты захады аб дастаўцы цэглы з Белыні.

Назіраліся выпадкі, калі школа займалася ў тры зьмены, а ў вёсцы ёсьць 6 нескарыстаных кулацкіх будынкаў (Якімава Слабада). Райвыканком прыняў захады для ліквідацыі гэтых ненармальных зьявішчаў.

Школамі яшчэ ня скончаны вучот дзяцей і няпісьменных. На месцы выехалі брыгады, якія заканчваюць гэты вучот.

Для лепшага забясьпечаньня дзяцей беднаты вопраткай і абуткам сярод насельніцтва сабрана больш 15.000 руб., але... каапэрацыя яшчэ не клапаціцца аб забясьпечаньні школьнікаў вопраткай і абуткам, ня гледзячы на тое, што атрымала авансы.

Брыгадзір НКА і «Сав. Бел.»

Бекарэвіч.

Кульмасавая работа на Случчыне самы забыты вучастак работы.

Пастановы партыйных і камсамольскіх зьездаў і зьезду Саветаў не пра працоўваюцца.

У большасьці сельсаветаў не выпускаюцца насьценгазэты. Нават і на трыкатажнай фабрыцы, дзе працуе 180 чал. рабочых, насьценгазэта ня выходзіць з 1-га мая.

Райінспэктура палітасьветы і іншыя арганізацыі ніякіх мер у гэтым напрамку ня прымаюць і спадзяюцца на самацёк.

К. Віньнік.

СОНЕЧНЫ ПАХОД

Пераводам будаўніцтва на зьдзельшчыну дабіліся посьпехаў

Калгас імя «16 партызан», Пухавіцкага раёну, па-ўдарнаму разгарнуў будаўніцтва. Плян будаўніцтва перавыкананы. Пабудавана ўжо 6 новых будынкаў, 2 гумна, с

Пастанова Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР

па дакладу Белкалгасцэнтру аб выкананьні пастаноў III Сэсіі ЦВК БССР IX скліканьня, X Усебеларускага і VI Усесаюзнага зьездаў саветаў пра калектывізацыю сельскай гаспадаркі

Т. Заслухаўшы даклад Старшыні Калгасцэнтру БССР т. Міцькова аб выкананьні пастаноў III Сэсіі ЦВК БССР IX скліканьня, X Усебеларускага і VI Усесаюзнага зьездаў саветаў «пра калектывізацыю сельск. гаспадаркі», Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **адзначае, што:**

1. Пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі і ўраду, калгасы БССР дабіліся вялікіх посьпехаў і атрымалі рашаючыя перамогі ў час веснавой сяўбы 1931 году:

а) Колькасьць калектывізаваных гаспадарак замест 14,7 проц. на 1 студзеня 1931 году ўжо дасягнула 43,3 усіх бядняцка-серадняцкіх гаспадарак на 1 жніўня 1931 году;

б) плян веснавой сяўбы калгасы выканалі на 103,4 проц., пры чым па лёне льны выкананы на 126,1 проц.;

в) калгасы паказалі рад далейшых прыкладаў высокай прадукцыйнасьці працы. Абагулены пасеў на адну калгасную гаспадарку больш чым напалову перавышае пасеў аднаасобнай гаспадаркі. Якасьць калгасных пасеваў значна палепшылася.

На падставе гэтых посьпехаў узмацніліся існуючыя калгасы і далей пасьпякова разгортваецца ніпераможны калгасны рух. Калгасы ўжо сталі асноўнымі продуктарамі на важнейшых вучастак сельскай гаспадаркі, вытворчасьці і цэнтральнай фігурай у земляробстве.

2. Адначасова з дасягнутымі посьпехамі ў калгасным будаўніцтве ёсьць рад прарываў на пасобных вучастках калгаснага будаўніцтва:

а) ня гледзячы на шпаркі рост калектывізацыі ў шэрагу раёнаў мела і мае месца стаўка на самацёк у справе калгаснага будаўніцтва. У радзе калгасаў, сельсаветаў і нават раёнаў зусім недастаткова вядзецца барацьба з кулаком і інш. ворагамі сацыялістычнага будаўніцтва, масы калгаснікаў і калгасьніц недастаткова мобілізаваны на барацьбу за новы калгасны прыліў.

У сувязі з гэтым рад сельсаветаў і раёнаў значна адстае ў тэмпах калектывізацыі. Ганебна адстаюць у разгортыньні калгаснага руху—Бабруйскі, Барысаўскі, Быхаўскі, Веткаўскі, Гомельскі, Глускі, Жлобінскі; Лельчыцкі; Пасынкі і Церахоўскі раёны;

б) надзвычайна дрэнна разгортваецца работа на арганізацыі і ўкамплектаваньню жывёлай малочна-таварных фэрм і сьвіна-таварных фэрм, на 20 ліпеня плян камплектаваньня па малочна-таварных фэрмах выкананы толькі на 67,5 проц., а па сьвіна-таварных фэрмах на 27,0 проц.

в) Зусім нездавальняюча ідзе здача таварнай прадукцыі, калгаснай жывёлагадоўлі, ў выніку чаго пляны па здачы таварных сьвіней за 1 паўгодзьдзе выкананы на 29,5 проц., а па здачы малака на 37,4 проц.

г) Асьбліва слаба разгортваецца работа па арганізацыі і камплектаваньні птушкаводных кролікаводных калгасных фэрм, маючых вялікае значэньне ў справе вырашэньня мясной праблемы. Пляны камплектаваньне птушкаводных фэрм выкананы толькі на 20 проц., а трусаводных гаспадарак на 15 проц.

3. Гэтыя буйныя недахопы арганізацыі калектыўнай вытворчасьці тлумачацца не аб'ектыўнымі прычынамі, не перавялічанымі заданьнямі, а недастатковым кіраўніцтвам з боку калгасаўзаў саветаў і райвыканкомаў і няўменьнем ладу калгасаў арганізаваць калектыўную гаспадарку на аснове тых вялізарнейшых магчымасьцяй, якія забясьпечваюцца ўмовамі Савецкага ладу і агромністай вытворчай дапамогай з боку пралетарскае дзяржавы.

4. Галоўным недахопам у рабоце калгасаў зьяўляецца дрэнная арганізацыя працы;

а) у значнай частцы калгасаў зьдзельшчына праведзена фармальна і не ліквідавана абязьлічка;

б) толькі 45,2 проц. калгасаў выдалі працоўныя кніжкі;

в) правільны вучот працы ў працадніёх вядуць толькі 54,3 проц. калгасаў;

г) брыгады часта маюць вельмі цяжкі склад і працуюць бесплана;

д) зусім недастаткова ўжываюцца мэтады брыгаднай і зьдзельнай работы ў галіне жывёлагадоўлі, гародніцтва і садоўніцтва;

е) у большасьці калгасаў зусім слаба выкарыстоўваецца і не арганізавана праца жанчын і падлеткаў;

ж) сацыялістычныя формы працы ня сталі яшчэ асноўным сродкам у справе ўзьняцьця творчай ініцыятывы шырокіх пластоў калгаснікаў, калгасьніц і ў значнай колькасьці калгасаў праводзяцца фармальна.

5. Улічваючы гэтыя недахопы ў калгасным будаўніцтве і асабліва адзначаючы слабае выкананьне пастаноў III сэсіі ЦВК БССР IX скліканьня, X Усебеларускага і VI Усесаюзнага Зьезду Саветаў у галіне арганізацыі працы ў калгасах і разьвіцьця калгаснай абагуленай жывёлагадоўлі, Прэзыдыум ЦВК з усёй рашучасьцю падкрэсьлівае што спыняцца на дасягнутых посьпехах калектывізацыі і арганізацыі калектыўнай вытворчасьці, ні ў якім выпадку нельга і што ўборачная і асеньняя пасяўная кампаніі і падрыхтоўка да вясеньняй кампаніі зьяўляюцца рашаючым зьвяном у справе замацаваньня і далейшага разгортваньня калгаснага будаўніцтва.

Прэзыдыум ЦВК БССР таксама падкрэсьлівае, што ўраджай вызначаецца ня тым, што вырасла на палёх калгасаў, а тым, што сабрана і паступіла ў распараджэньне пралетарскай дзяржавы і заклікае ўсе калгасы, усіх калгаснікаў і калгасьніц сваячасова і поўнасьцю з найменшымі стратамі ўбраць, абмалаціць і апрацаваць ураджай, сваячасова і поўнасьцю здаць таварныя лінькі—пралетарскай дзяржаве. Асаблівую ўвагу трэба зьвярнуць на ўборку і апрацоўку тэхнічных культур.

II. Прэзыдыум ЦВК БССР прапануе:

1. НКЗ, Калгасцэнтру, выканаўчым камітэтам і саветам далейшую работу па калектывізацыі арганізаваць у строгай адпаведнасьці з пастановай ЦК УсесКП(б) ад 2-VIII—«аб тэмпах далейшай калектывізацыі і задачах узмацненьня калгасаў», паставіўшы цэнтральнай задачай замацаваньне калгасаў, ні ў якім разе не паслабляючы тэмпаў калектывізацыі, вядучы рашучую барацьбу з апартуністычнай стаўкай на самацёка і спробамі адміністраваньня;

2. Улічваючы, што арганізацыя працы зьяўляецца асноўным зьвяном у калгасным будаўніцтве, Белкасцэнтру, райвыканкомам, саветам і праўленьням калгасаўзаў правесьці наступныя мерапрыемствы ў галіне арганізацыі калектыўнай працы і яе ўліку:

а) ўсе бяз выключэньня работы ў калгасах павінны быць пераведзены на зьдзельшчыну;

б) усе працаздольныя калгаснікі і калгасьніцы павінны атрымаць працоўныя кніжкі, ў якіх ня менш чым раз у пяцідзёнку павінна запісвацца праробленая работа, налічаныя працадні з улікам якасьці работы;

в) абязьлічка павінна быць канчаткова ліквідавана, кожная машына і с.-г. прылады і кожны конь і збруя павінны быць прымацаваны да сталых калгасьнікаў і калгасьніц;

г) у мэтах зьнішчэньня непатрэбнай бягучасьці асабістага складу брыгад, перафарміраваньне і перастаноўку сіл, як унутры брыгады, так і паміж пасобных брыгад рабіць толькі ў выпадку сапраўднай патрэбы. Кожны калгаснік і калгасьніца павінны спэцыялізавацца па тэй альбо іншай галіне працы;

д) кожны калгас павінен мець рабочы плян уборачных і асеньніх работ, па якім і павінны праходзіць работы ў калгасе.

3. Зьвярнуць асаблівую ўвагу на правільнае разьмеркаваньне ўраджаю і прыбыткаў у калгасах. Толькі сваячасовае разьмеркаваньне ўраджаю па колькасьці і якасьці выкананай работы, бязьлітасная барацьба з ураўніліўкай (жаданьне разьмяркаваць ураджай па едакох), рост непадзельных фондаў і поўнае стварэньне кармавых і насеньных фондаў забясьпечваюць замацаваньне і далейшы ўздым калгаснага руху. Таму Прэзыдыум ЦВК БССР заклікае ўсе калгасы разьмяркаваць ураджай у тэрміны і на асновах прадугледжаных пастановай чэрвеньскага пленуму ЦК УсеКП(б).

4. Падкрэсьліваючы вялізарнейшае значэньне малочных, сьвінагадоўчых і птушкаводных калгасных таварных фэрм у справе вырашэньня жывёлагадоўчай праблемы, Прэзыдыум ЦВК БССР даручае НКЗему, Белкалгасцэнтру, раённым выканаўчым камітэтам і саветам і заклікае ўсе калгасы, калгаснікаў і калгасьніц напружыць усе сілы і скарыстаць усе магчымасьці, каб поўнасьцю і ў тэрмін выканаць заданьне аб укамплектаваньні да канца 31 г. малочна-таварных фэрм на 78 т. галоў кароў, сьвінатаварных фэрм на 150 т. сьвіноматак і птушка-таварн. фэрмы на 90 т. птушак. Трэба мабілізаваць усю масу калгаснікаў і калгасьніц на выкананьне гэтай важнейшай гаспадарча-палітычнай задачы і скарыстаць усе магчымасьці для поўнага яе выкананьня. У пасобку трэба правесьці наступныя мерапрыемствы:

а) да першага студзеня 1932 г. скончыць укамплектаваньне сьвінагадоўчых і малочных таварных калгасных фэрм жывёлай за рахунак унутраных рэсурсаў самих калгасаў (100 проц. захаваньне маладняка паленішаньня доглядзу жывёлы, пакупка ў калгаснікаў, абмен і пазычкі), на аснове шырокага разгортваньня масавай работы сярод калгаснікаў;

б) да першага кастрычніка скончыць будаўніцтва новых і прыстасаваньне старых сьвінарнікаў і кароўнікаў, усяма мерамі скарыстоўваючы мясцовыя будаўнічыя матар'ялы і спрашчаючы само будаўніцтва;

в) дабіцца перавыкананьня пляну па здачы таварнае прадукцыі па сьвінагадоўчых фэрмах і калгасах ня менш 210.000 галоў і малочных 46.000 тон, шляхам павялічэньня таварнасьці жывёлагадоўлі, рашучай барацьбы з спажывецкімі настроямі ў калгасах і разбазарваньнем жывёлы, устанавіўшы суровы прамадзкі кантроль над здачаю таварнае прадукцыі жывёлы;

г) у мэтах поўнага забясьпечаньня калгаснай жывёлагадоўлі ўласнымі кармамі, як грубымі, так і канцэнтраванымі, правесьці сваячасова і поўнасьцю ўборку сенажацей, зернавых культур і парнеклубнеплодаў, устанавіць суровы кантроль у выдаткаваньні і рацыянальным скарыстаньні кармоў, поўнасьцю выканаць плян сіласаваньня, забясьпечыўшы сілосам па буйнай рагатай жывёле ня менш, як 3 тоны на 1 карову і па сьвіньнях 1,2 тоны на 1 сьвіноматку з прыплодам і абслугоўваючай жывёлай;

д) усю працу па жывёлагадоўлі перавесьці на зьдзельшчыну, наліччэньне працадзён калгаснікам і калгасьніцам, працуючым па жывёлагадоўлі, паставіць у залежнасьці ад якасьці догляду жывёлы (100 проц. захаваньня маладняка, павялічэньне вагі жывёлы, удойлівасьці і інш.), рашуча зьнішчыць абязьлічку ў працы па жывёлагадоўлі.

5. Зьвярнуць асаблівую увагу на ўдзгненьне жанчын у сацыялістычную вытворчасьць калгасаў, і стварэньне адпаведных умоў для поўнага і рацыянальнага скарыстаньня іх працы, шляхам шырокага разгортваньня работы на арганізацыі дзіцячых ясьляў, пляцовак, грамадзкіх сталовак і г. д.

6. Надаючы вялікае значэньне пытаньню забясьпечаньня сацыялістычнай прамысловасьці рабочай сілай, зьвярнуць увагу ўсіх РВК, сельсаветаў і калгасаў на неабходнасьць поўнага і сваячасовага задавальненьня запатрабаваньняў прамысловасьці ў рабочай сіле, шляхам арганізацыі плянавага адыходніцтва, заключэньня дагавораў прадстаўленьня льгот адыходнікам.

7. Зьвярнуць асаблівую ўвагу Белкалгасцэнтру, НКЗему, і райвыканкомаў на падрыхтоўку кваліфікаваных кадраў для калектыўных гаспадарак, а таксама ўжыць адпаведныя мерапрыемствы па ліквідацыі няпісьменнасьці сярод калгаснікаў.

8. Белкалгасцэнтру, НКЗему, выканкомам і саветам шырока папулярызаваць мэтад абмену вопытам у рабоце калгасаў з мэтай скарыстаньня і перанясеньня ў іншыя калгасы лепшых прыкладаў у рабоце.

9. Пасьпяховая барацьба за выкананьне вялізарнейшых задач 3-га рашаючага году пяцігодкі і ажыцьцяўленьне лёзунгу суцэльнай калектывізацыі сустракаюць моцнае супраціўленьне кулацтва і яго агентаў. Таму бязьлітасная няпрымірымая барацьба з кулацтвам і яго агентамі і ўзмацненьне работы па арганізацыі батрацтва і беднаты зьяўляецца асноўнай задачай усіх калгасаў, калгасных саюзаў, сельсаветаў і райвыканкомаў.

10. Прэзыдыум ЦВК прапануе райвыканкомам і саветам разгарнуць найбольш шырока масавую работу навакол пытаньняў далейшай калектывізацыі бяднацка-серадняцкіх гаспадарак, умацаваньня існуючых калгасаў і правільнага наладжваньня работы ў іх.

Для пасьпяховага выкананьня гэтай вялізарнейшай і адказьнейшай задачы неабходна прыцягнуць увесь савецкі актыў, у пасобку больш цесна зьвязацца з прафсаюзнымі арганізацыямі, скарыстаўшы таксама сілы мясцовай працоўнай інтэлігенцыі — Чырвонаштандарната настаўніцтва, арганомаў, дактароў і інш.

11. Даручыць цэнтральным і раённым органам друку і пасьцэнтаэтам шырока асьвятляць жыцьцё і работу пасобных калгасаў, а таксама пераламленьне імі ў сваёй дзейнасьці дырэктыў партыі і ўраду ў галіне калгаснага будаўніцтва.

Час. вык. аб. Старшыні Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
М. Гнілякевіч.

За Сакратара Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
Б. Вансоўскі.

5 жніўня 1931 г.
гор. Менск.

АПАВЯШЧЭНЬНЕ

Культпроп ЦК КП(б)Б паведамляе, што куставыя нарады па падрыхтоўцы да новага 1931—32 навучальнага году адбудуцца ў наступным парадку:

1) **Менскі куст**—17 жніўня, з удзелам раёнаў: Барысаўскага, Бягомльскага, Бярэзінскага, Бабруйскага, Вузьдзенскага, Глускага, Заслаўскага, Капыльскага, Крупскага, Койданаўскага, Асіпавіцкага, Любанскага, Лагойскага, Пухавіцкага, Плешчаніцкага, Слуцкага, Стара-Дароскага, Старобінскага, Смалявіцкага, Талачынскага, Чырвона Слабоцкага і Чэрвоньскага.

2) **Віцебскі куст**—17 жніўня, з удзелам раёнаў: Асьвейскага, Бешанковіцкага, Вушацкага, Гарадокскага, Дрысьненскага, Лязьнянскага, Лепельскага, Полацкага, Расонскага, Сеньнонскага, Сіроцінскага, Чашніцкага і Сураскага.

3) **Гомельскі куст** 20 жніўня з удзелам раёнаў: Брагінскага, Буда-Кашалёўскага, Ельскага, Жлобінскага, Жыткавіцкага, Камарынскага, Лельчыцкага, Мазырскага, Нараўлянскага, Парыцкага, Петрыкаўскага, Рэчыцкага, Тураўскага, Уваравіцкага, Хойніцкага, Чачэрскага, Веткаўскага, Церахаўскага і Лоеўскага.

4) **Магілеўскі куст**—20 жніўня з удзелам раёнаў: Аршанскага, Бялыніцкага, Быхаўскага, Горацкага, Дубровенскага, Кармянскага, Касьцюковіцкага, Клімавіцкага, Крычаўскага, Мсьціслаўскага, Клічаўскага, Прапойскага, Рагачэўскага, Чэрыкаўскага, Чавускага, Чырвонапольскага і Шклоўскага.

На нараду абавязкова павінны зьявіцца прадстаўнікі ГК і РК КП(б)Б, ЛКСМБ, інспэктары нарасьветы, адказныя працаўнікі гаррайпраўленьняў саюзу працасьветы з пісьмовай справаздачай аб становішчы падрыхтоўкі да новага навучальнага году.

Праца нарады пачнецца а 10 гадзіне раніцы.

Рэгістрацыя дэлегатаў будзе праводзіцца ў адпаведных парткомах.

Загадчык культпропу ЦК КП(б)Б
ЧАРНУШЭВІЧ.

Выраж для памяці

Рабочая праграма

па арганізацыі ўборкі бульбы ў калгасах

Правільная і сваячасовая ўборка бульбы зьяўляецца адным з адказьнейшых гаспадарча-палітычных задач.

Пасьпяховае правядзеньне ўборкі бульбы будзе забясьпечана толькі пры ўмовах правільнай арганізацыі працы на падставе сапраўднай зьдзельшчыны і сваячасовага ўліку працы, правільнай глыбока прадуманай расстаноўкі сіл, арганізацыі штодзеннага самакантролю і безадкладнага зьнішчэньня промахаў ў рабоце на падставе ўздыму самадзейнасьці калгасных мас і шырокага разгортваньня сацыялістычных мэтадаў працы,—сацспабор ніцтва і ўдарніцтва.

Бульба сваячасова будзе ўбрана і па гаспадарчы рэалізавана толькі пры ўмовах чоткага календарнага плянавага апэрацыйнага кіраўніцтва як з боку праўленьняў калгассаюзаў, гэтак і з боку саміх калгасаў.

Выходзячы з гэтага, Праўленьне Калгасцэнтру ставіць перад усімі калгасамі і Калгассаюзам наступныя практычныя задачы:

1. Не пазьней як за 2 тыдні да пачатку работы па ўборцы бульбы на гадставе шырокага растлумачэньня асаблівасьцяй умоў пэрыяду ўборкі бульбы (напружанасьць у працы, маслівасьцяў кепскага дажджлівага надвор'я і раньніх замаразкаў, неабходнасьці максымальнага скарыстаньня добрага надвор'я і г. д.) прапанаваць і абгаварыць на вытворчых нарадах і агульных сходах калгаснікаў і калгасьніц усе пытаньні, зьвязаныя з уборкай бульбы (тэрміны ўборкі, арганізацыя брыгад, парадак прэміраваньня і г. д.).

2. Паставіць, як задачу перад кожным калгаснікам і дабіцца поўнага ахопу сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам усіх брыгад, груп і пасобных калгаснікаў, шырока выкарыстоўваючы мэтады сустрэчных плянаў работ. Поўнасьцю выкарыстаць па ўборцы бульбы ўсіх жанчын падлеткаў, а таксама і мужчын.

3. Да пачатку ўборкі бульбы ўсе калгасы павінны адрамантаваць і набыць патрэбны інвэнтар: плугі, цялегі, скрыні для возкі бульбы і г. д. Асабліву ўвагу трэба зьвярнуць на поўнае скарыстаньне бульбакапалак.

4. Уборку бульбы пачаць, калі скурка на бульбінак зацьвярдзее, бо бульба, убраная з маладой скуркай, кепска захоўваецца. Прыкладна ўборку пачаць у паўднёвых раёнах 5 верасьня, у сярэдніх—10 верасьня і паўночных—15 верасьня. Спачатку ўбіраюцца больш ранныя гатункі (хуткасьпелыя) у якіх бульбінік да пэрыяду пасьпяваньня бульбы адмірае. Бульбінік, асабліва больш позьніх гатункаў бульбы, якая захоўваецца зялёнай да самых замаразкаў, неабходна перад уборкай скасіць і засіласаваць. Пасаваны-ж бульбінік фітафтораў (мокрай гніллю), неабходна дзён за 10 да ўборкі скасіць, зьвесьці з поля і спаліць.

5. Уборку праводзіць у сухое яснае надвор'е. Убраная пры такіх умовах бульба лепш захоўваецца.

6. Яшчэ да пачатку ўборкі бульбы ўсе калгасы павінны распрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы па здачы таварнай прадукцыі з тым, каб асноўная маса бульбы, падлягаючай здачы (продажу) дзяржаўным і кааперацыйным арганізацыям з тым, каб бульба была зьвезена на загатоўчыя пункты непасрэдна з поля. Разам з гэтым трэба асобна адабраць насенную бульбу, улічваючы пашырэньне пасеву на весну 1932 году, і належным чынам яе захаваць. Кармовая бульба павінна захоўвацца з такім разьлікам, каб ня было лішніх перавозак.

7. Уборку бульбы праводзіць выключна брыгадамі, зьдзельна з ацэнкай работ у працадніёх.

8. Разьмер брыгады ўстанавіць у наступным складзе: 17 калгаснікаў і калгасьніц, 4—6 коняй, у залежнасьці ад спосабу запражкі, 1 плуг, 4 вазы, з якіх 2 вазы запасных для насыпу бульбы пры выбарцы.

9. Кожнай брыгадзе вызначыць заданьне і адвесьці сталы вучастак бульбы на ўвесь час уборкі, ня менш як 10 га, якія павінны быць убраны і забуртаваны на працягу 10 дзён.

10. Унутры кожнай брыгады робіцца наступная расстаноўка сіл:

а) **1 плуг, 2 кані і 1 калгаснік** выворваюць бульбу. Выворваньне бульбы праводзіцца за 2-3 гадзіны да выбаркі з тым, каб яна прасохла;

б) **10 калгасьніц, або калгаснікаў выбіраюць бульбу і ссыпаюць на воз.** Калгаснікам, якія выбіраюць бульбу, даецца заданьне па некалькі баразён з тым, каб магчыма было брыгадзіру праверыць у любы момант дня і ўлічыць работу кожнага выбіральшчыка, гэта значыць, што ўнутры брыгады работу кожнага калгасьніка можна праводзіць на падставе індывідуальнай зьдзельшчыны. Праверку робіць брыгадзір, або проста рукамі сьледам за выбіральшчыкамі, або нарэзкай кантрольных баразён, пры гэтым праца лічыцца здавальняючай, калі бульба падабрана ўся;

в) **4 вазы, 2 кані пры аднаконных вазох, або 4 вазы і два кані пры параконных цялегах і 2 калгасьнікі падвозяць выбраную бульбу** да месца хаваньня (бульбахавальнікаў, або капцоў) і ссыпаюць тонкім пластом ня больш 30 см. (7—8 вяршкоў) таўшчынёю для прасушкі. У мокрае надвор'е бульба для прасушкі ссыпаецца папярэдня пад навець, у пуню, гумно і г. д.;

г) **2 калгасьніцы або калгасьнікі дастаўленую да месца хаваньня бульбу** сартуюць на насеньне, кармы, харчовую альбо тэхнічную. Пасаваную бульбу, якая ня можа захоўвацца, трэба адбіраць і скарыстаць у корм жывёле. Пры гэтым бульба з вучастку, пашкоджаных фітафтораў (мокрай гніллю) павінна ссыпацца асобна і да сартаваньня павінна паляжаць пад дахам на працягу каля 2-х тыдняў; толькі пасьля гэтага яна адсартоўваецца і пашкоджаныя мокрай гніллю бульбіны закапваюцца ў зямлю;

д) **2 калгасьнікі адабраную здаровую бульбу або ссыпаюць у бульбахавальнікі,** або забуртоўваюць. Асобна вылучаецца адпаведная колькасьць калгаснікаў і коні для перавозкі бульбы на нарыхтоўчыя пункты. Хаваць бульбу, асабліва сталовую, лепш у спэцыяльных бульбахавальніках. Пры адсутнасьці бульбахавальнікаў выбіраецца высокае сухое месца проста на полі, на месцы конкі бульбы. Капаецца катлаван у 15—20 см. (4—5 вяршк.) глыбіні і ў 3 мтр. шырыні і даўжынёй з разьліку на захаваньне ўраджаю з 1 га. На дно катлавана па ўсёй яго даўжыні кладуцца моцна зьвязаныя пучкі хмызьняку, або снопы цьвёрдай саломы (лепш драўняную трыкутную трубу з дошчак у 20 см. шырыні кожная, з пракручанымі па ўсёй даўжыні дзіркамі). Ад пучкоў хмызьняку або саломы даверху бурта праз яго сярэдзіну ставяцца слупкамі таксама моцна зьвязаныя ў пучкі снопы цьвёрдай саломы на адлегласьці 3—5 мтр. пучок ад пучка па даўжыні бурта. Вярхушкі пучкоў саломы зьверху бурта павінны быць туга пераціснуты, каб не пападала ў бурт вільгаць. Пасьля гэткай падрыхтоўкі бульба пасыпаецца кучай выпынёю ня больш аднаго мэтра, куча павінна мець форму двухскатнага даху. Пасьля ўкладкі бульбы ў бурт апошні закрываецца з ўсіх бакоў саломай таўшчынёю ў 50 см., а па салому накладваецца зямля, спачатку таўшчынёю ў 16—20 см., а пры надыходзе халадоў зямлі дабаўляецца да таўшчыні 30—40 см. Зямля бярэцца на адлегласьці 1 мтр. ад бурта з такім разьлікам, каб навакол бурта атрымалася канаўка.

Пасьля сканчэньня ўборкі бульбы абавязкова робіцца перанахваньне бульбы, для чаго арганізуецца брыгада кожныя 10 га у складзе 15 калгаснікаў; 30 коні і 15 плугоў для перапашкі і 30 калгасьніц для падборкі бульбы.

11. Ацэнка работ праводзіцца прыкладна наступным чынам:

а) **Выворваньне 1 га бульбы ацэньваецца 1,25 працадня.**

б) выбарка 1 га бульбы ацэньваецца ў 10 працадзён пры ўраджаі ў 100 цнт. з 1 га, у 15 працадзён пры ўраджаі ў 200 цнт.; налічэньне кожнаму з калгаснікаў выпрацаванай ім работы, напрыклад, калі ён выбраў 0,1 га бульбы, то яму залічваецца 1 працадзень, калі ён выбраў 0,15 га—налічваецца 1,5 працадня;

Увага: вылічэньне плошчы на кожнага калгасьніка робіцца па ліку баразён, выходзячы з агульнай колькасьці баразён на га.

в) за перавозку 50 цнт. бульбы на адлегласьць 1 клм. налічваецца 1 працадзень; пры меншай адлегласьці налічэньне працадзён адпаведна памяншаецца, пры большай—павялічваецца.

г) за **сартоўку 50 цнт. бульбы налічваецца 1 працадзень;**

д) за **забуртаваньне 50 цнт бульбы налічваецца 1,25 працадня.**

Увага: Вага бульбы адзначаецца на ліку вазоў з 1 га.

е) за перапашку з 1 га бульбы налічваецца 1,5 працадні, за падборку 3 працадні.

12. Брыгадзір нясе поўную адказнасьць за якасьць работы і сваячасовае выкананьне плянавых заданьняў брыгадай, таму пэрыядычна, на працягу дню ён робіць праверку колькасьці і якасьці работы кожнай групы ўнутры брыгады і кожнага калгасьніка ўнутры групы. Безадкладна, на ходу зьнішчаючы ўсе тормазы і недахопы ў рабоце, абавязвае калгасьніка, кепска выканаўшага работу, безадкладна яе выправіць, а пры адказе калгасьніка ад выпраўленьня работы, такому калгасьніку расцэнка работы зьніжацца.

13. Штодзенна ў канцы дню брыгадзір робіць колькасную і якасную прыёмку работ і ўлік выкананай работы кожным калгаснікам з запісам у яго працоўную кніжку.

14. Прыёмка работы ад брыгады пасьля выкананьня ёю заданьня робіцца членам праўленьня, які кіруе паляводствам.

15. Лепшыя брыгады, брыгадзіры і пасобныя калгаснікі за датэрміновае і дабраякаснае выкананьне работ прэміруюцца са спэцыяльна вылучанага на правядзеньне ўборкі бульбы фонду адпаведнай колькасьцю працадзён. У лік апошніх ім могуць быць выданы прамтавары, таксама са спэцыяльнага створанага для прэміраваньня ўдарнікаў фонду прамтавараў.

«Ураджай адзначаецца ня тым, што вырасла на палёх калгасаў, а той колькасьцю прадукцыі, якая фактычна ўбрана і паступіла ў распараджэньне пралетарскай дзяржавы» (Якаўлеў).

Старшыня Праўленьня
Калгасцэнтру БССР **Міцькоў.**

З лістоў рабселькораў

У калгасе «Ленінскі Шлях», Кохановіцкага раёну не праводзіцца ніякой культмасавай работы.

Старшыня культкамісіі Каранецкі Макар бязьдзейнічае.

Старшыня праўленьня калгасу таксама культмасавай работай і справай абслугоўваньня апошняй сельска-гаспадарчай кампаніі зусім ня цікавіцца, а займаецца п'янкай.

Неабходна наладзіць культработу ў калгасе і паставіць яе на службу ўборачнай кампаніі.

П.

У Дрыбенскім Нардоме ёсьць радыё прыёмнік, якога на працягу году ніхто ня чуў, бо ён не працуе.

Насьпенгазэта бяз зьмены па некалькі месяцаў.

Практыкант.

Тры месяцы тэрыторыя Багуніцкага сельсавету не абслугоўваецца кінопересоўкай, ня гледзячы на тое, што ў сельсавеце шмат калгасаў. Калгаснікі абураны гэтым фактам.

Малінoўскі.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

ЦЫРК-КІНО-ТЭАТР

МЕНДЗЯРЖ-ТЭАТР — Гастролі муз. камэдыі пад кіраўніцтвам Міраева **МАРАКІ**
Продаж білетаў у рабочай касе з 12-21 з 4-6 г.
У касе тэатру з 12-21 з 5-9 гадз. увеч.

Дзяржц ЦЫРК — Сеньня дзбют новых артыстых
Лепшы у СССР атракцыён 4 ЭЛЬВОРЦІ 4
3 Голядзе 3 | Вероніка муз. акробаты
Новая дрэсіроўка А. В. Лапіада
Паветраны палёт ВАЛЕНЦІНІ
2 Сазоновы 2 з пяршом | Тік-Так акробаты эксцэнтрыкі
Пачатак а 9 гадз. Льготныя білеты ў рабочай касе.
Па заяўкам ФЗМК скідка 40 проц.

Кіно-тэатр Культура — З 8-га жніўня новы маотацкі фільм „Дзяржаўны чыноўнік" у гал. ролі Рогожын

Кіно „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ" — Ад 15-га жніўня Парыскі шавец Звыш праграмы кіно нарыс № 15
Белдзярж іно.
Пачатак а 7 гадзіне. Каса а 5 гадз.

Кіно „ПРАЛЕТАРЫ" — З жыцьця Тургенева „АСЯ"
Пачатак а 2, 3-45, Вач. а 7, 8-45 і 10-30 г.

„Чырвоная Зорка" — Сёньня і штодзённа Міс-Мэнд
Пачатак а 7 гадз.

Горнае аддзяленьне Менскага Дзяржаўнага Архітэктурна-Будаўнічага Тэхнікуму
АБВЯШЧАЕ АСЕНЬНІ НАБОР
БУДЗЕ ПРЫНЯТА 60 АСОБ
Асобы, якія скончылі 7-мігодкі, прафтэхшколы, будвучы, курсы па падрыхтоўцы ў тэхнікумы і інш. навучальныя ўстановы ня ніжэй 7-годкі прымаюцца бяз іспытаў
Узрост паступаючых ад 15 да 25 год. 65 проц. студэнтаў забясьпечваюцца стыпэндыяй і інтэрнатам
ЗАЯВЫ ПРЫМАЮЦЦА ДА 1 га ВЕРАСЬНЯ
Заявы з анкетай і дакумантамі, згодна правіл прыёму (даведнік НКА БССР) накіроўваць на адрас: Менск, вуліца Карла Маркса № 37
Дырэктар тэхнікуму АНОДЗІН

Беларускаму Дзяржаўнаму Унівэрсытэту і Вышэйшаму Пэдагагічнаму Інстытуту
ПАТРЭБНЫ НА СТАЛУЮ ПРАЦУ
кіраўнікі вытворчай практыкай—інжынэры і аграномы
Апрача кі аваньня практыкай, памянёным вышэй асобам могуць быць даданы дадатковыя заняткі са студэнтамі па іх спэцыяльнасьці.
— АПЛАТА ПА ЗГОДЗЕ: —
Заявы падаваць: БДУ, галоўны корпус канцэлярыя ўнівэрсытэту да 25 жніўня г.г.

Беларускі Дзяржаўны Мэдычны Інстытут
АБВЯШЧАЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭНЬНЕ ПАСАД
ардынатараў і асьпірантаў па катэдрах стоматалёгіі, псыхіатрыі, вушных хваробах, вочных хваробах, хірургіі, акушэрства і тэрапіі.
Неабходна прадстаўленьне аўтабіяграфіі, рэкомэндацыя савецкіх і грамадзкіх арганізацый і згоды райздраву на конкурс.
Прыём заяў да 20-VIII-31 г.
Адрас: Менск, Унівэрсытэцкі Гарадок Мэдінстытут
ДЫРЭКТАР

Беларускі Дзярж. Мэдычны Інстытут
— абвяшчае, што —
ПРЫЕМ НА ФАКУЛЬТЭТЫ
саніт.-профіляктычны, лекава-профіляктычны з аддзяленьнямі: стоматолёгічным, охматмладу, хірургічным і тэрапэўтычным ПРАЦЯГВАЕЦЦА да 1-IX,
Дакуманты прадстаўляць па адрасу:
Менск, Унівэрсытэцкі гарадок, Мэдінстытут, Дырэкцыі.
Дырэктар М. КРОЛЬ

Беларускі Дзяржаўны Унівэрсытэт
АБВЯШЧАЕ АСЕНЬНІ НАБОР СТУДЭНТАЎ
на наступныя факультэты:
1. Фізыка-матэматычны (белар. і яўр. сэкцыі). 2. Хэмічны (беларуская сэкцыя)
Заявы прымаюцца да 20-га жніўня г. г. у канцэлярыі БДУ (Менск, Унівэрсытэцкі гарадок, галоўны корпус).
Іспыты для тых таварышоў, якія ня маюць сярэдняе асьветы, будуць праводзіцца 27, 28 і 29 жніўня. Правілы прыёму абвешчаны ў даведчыку НКА.
70 проц. прынятых студэнтаў забясьпечваюцца стыпэндыяй і інтэрнатам. Для сямей студэнтаў БДУ кватэр не прадстаўляе.
Аб тэрміне пачатку заняткаў з новым наборам будзе ПАВЕДАМЛЕНА АСОБНА
ЧВП Рэктара БДУ В. Рудніцкі

ПРЫЕМ ЗАЯЎ У ШКОЛУ ФЗУ СУВЯЗІ ПРАЦЯГВАЕЦЦА
да 1-IX 1931 года.
Аддзяленьні: тэлеграфнае, тэлефоннае і радыё рыхтуюць кваліфікаваных маніпэраў сувязі.
Прымаюцца асобы з адукацыяй 7-мігодкі. Курс навучаньня 2 гады.
Стыпэндыяй забясьпечваюцца на першым курсе ўсе залічаныя. Разьмер стыпэндыі на першым курсе 24 руб.
Інтэрнатам пакуль што не забясьпечваюцца. Заявы накіроўваць: Менск, Ленінская вул. № 36.
ДЫРЭКЦЫЯ.

Менскі Вячэрні Рабочы Тэхнікум
АБВЯШЧАЕ АСЕНЬНІ НАБОР
на аддзяленьні: Архітэктурна-Будаўнічае — 120 асоб, Мэханічнае—150 асоб
Прымаюцца выключна рабочыя, маючыя ня менш 3-х гадовы вытворчы стаж, кваліфікацыя—ня ніжэй 3-га разраду і асьвету за 6 груп 7-мігодкі і вышэй.
Тэрмін прыёму заяў з 1-VIII па 1-IX-1931 году ў канцэлярыі Тэхнікуму (вул. Карла Маркса № 37) тут-жа магчыма атрымаць даведкі і анкету.
1—2—3
Дырэтар ВРТ АНОДЗІН

СОНЕЧНЫ ПАХОД

Барысаўская ЛЕСАЭКСПЛЁАТАЦЫЙНАЯ ПРАФТЭХШКОЛА (ЛПВ) ТРЭСТУ „ЛЕСБЕЛ"
абвяшчае
асеньні прыём 60 чал.
Заявы прымаюцца
з 1 ліпеня па 1 верасьня
У школу